ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**Ці лёгка стаць дударом?**



**«Маркер» для лейкацытаў**



**Юбілейны бой Максіма Мірнага**

СТАР. 16

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак:**

*«Беларусь за пяць гадоў можа ўвайсці ў лік самых перадавых краін у галіне транспланталогіі. Цяпер у нас выконваецца больш за 53 аперацыі на 1 млн жыхароў па трансплантацыі органаў. Гэта дастойны еўрапейскі і сусветны паказчык. Думаю, у наступныя пяць гадоў падымем яго да 60—70 на 1 млн, што на ўзроўні дзесяці самых перадавых краін свету ў гэтай галіне. Гэта значыць, што ўсё звязанае з беларускай трансплантацыяй, у свеце будзе лічыцца не проста як топ, а супертоп».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8808 | ▼ |
| Еўра | 2,0083 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17065

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 КРАСАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 65 (28429)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# У паход за здароўем



Фота БЕЛТА.

Удзельніцы фітнес-гуртка «Азбука здароўя», які дзейнічае на базе цэнтра тэрытарыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў Іўеўскім раёне, з задавальненнем займаюцца скандынаўскай хадзьбой.

■ На свае вочы

## ПОГЛЯД З ВЯСКОВАЙ «ВЫСОТКІ»

### Чым ганарацца жыхары «вёскі будучыні» і на што спадзяюцца

**Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы ў лістападзе мінулага года, у кожным рэгіёне краіны вызначаны вёскі-«маякі», якія павінны стаць прыкладам для іншых. У Гродзенскай вобласці ў перспектыўны план «Вёска будучыні» ўвайшоў аграгарадок Абухава Гродзенскага раёна.**

Даехаць да Абухава з Гродна асаблівых праблем няма. Населены пункт знаходзіцца за сотню метраў ад трасы М6. Ходзяць аўтобусы, маршруткі, за хвілін 20—25 можна дабрацца. Многія адтуль ездзяць у Гродна на працу сваім транспартам. Так рабілі і Кацярына з мужам, пакуль не нарадзілася дачка. Зараз маладая маці шпацыруе з каляскай па вуліцах аграгарадка, дзе мы і сустрэліся сонечным ранкам.

Кацярына ахвотна расказала, што яны з мужам купілі тут год назад кватэру, хоць абое гараджане. Муж — гродзенец, а сама яна з Мінска, прывыклі да камфорту. Калі разглядалі варыянты, убачылі, што ў Абухаве ўмовы пражывання такія, як у горадзе, а цана на кватэру ніжэйшая. З плюсаў Кацярына адзначыла лепшую экалогію, добрую інфраструктуру, для дзяцей — магчымасці творчага і спартыўнага развіцця. Тут ёсць спартыўная і мастацкая школы.

СТАР. 2



■ Вандроўнікам на заметку

## ДАЙВІНГ, ПАДАРОЖЖЫ НА ПЛАТАХ І БАЛОТАХОДАХ

### Чаго чакаць ад экатурызму?

**Маляўнічыя мясціны, некранутыя куткі прыроды, багацце расліннага і жывёльнага свету — тыя магніты, якія могуць прыцягваць турыстаў. Трэба толькі гэта ўбачыць і, галоўнае, прыгожа, даступна і цікава давесці да спажыўца.**

**Як адзначыў начальнік упраўлення біялагічнай і ланшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай СВІДЗІНСКІ, наша краіна валодае значным патэнцыялам для развіцця экатурызму. Але трэба яшчэ многа зрабіць для таго, каб прывабіць гасцей на «зямлю пад белымі крыламі». Напрыклад, патэнцыял асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый з такой мэтай у нашай краіне выкарыстоўваецца менш чым на трэць. Таму ў Нацыянальную стратэгію развіцця сістэмы асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый у студзені гэтага года былі ўнесены змяненні і дапаўненні, якія якраз датычацца «раскруткі» экатурызму.**

### Вядомыя і не раскручаныя

Як заўважыў Мікалай Свідзінскі, не заўсёды стварэнне інфраструктуры на базе саміх нацпаркаў і заказнікаў вядзе да развіцця турызму: «Аналіз работы прыродаахоўных устаноў паказвае, што поспехаў можна дасягнуць толькі ў кааперацыі з вытворцамі мясцовага турпрадукту». Будучыня экатурызму за развіццём комплексных паслуг. Напрыклад, пазнавальныя экскурсіі запатрабаваны ў турыстаў, якія размяшчаюцца і харчуюцца ў аграсядзібах. Прывабліваць гасцей на ахоўваемыя тэрыторыі можна і разнастайнымі мерапрыемствамі. Так, ужо традыцыйнымі сталі фестывалі сенакосу ў Спораўскім заказніку, «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю» ў Ельні, «Кліч Палесся» ў Прыпяцкім нацпарку.

Безумоўна, давядзецца папрацаваць і над «абгорткай» для новага турпрадукту. Сёння толькі нацпаркі і запаведнік маюць зарэгістраваныя брэнды і сімволіку, заказнікам таксама варта было б паклапаціцца аб тым, каб зрабіць сваю тэрыторыю больш «пазнавальнай». Вядзецца гаворка і аб неабходнасці стварэння брэнда наогул для экатурызму краіны.

Варта сказаць, што ўжо сёння гасцей у Беларусь можна завабліваць не толькі на арніталагічныя туры і фотапаляванне, якія папулярныя ў еўрапейцаў. Турыстам прапануюць экскурсіі на балотаступах і балотаходах, вывучэнне ў прыродзе слядоў дзікіх жывёл, навучанне дайвінгу і яздзе конна, паходы на плытах, назіранні за зубрам. Між іншым, каб паглядзець на беларускага волата, зусім не абавязкова ехаць у Белавежскую пушчу — мікрапапуляцыі зубра ёсць і ў заказніках «Азёры» і «Налібоцкі».

СТАР. 3

# ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ

## Такі тэрмін даў Прэзідэнт на прывядзенне ў парадак мясцовых дарог

**Дарогі — у многім вітрына, нават твар краіны. Тым больш што Беларусь — транзітная дзяржава, а з нядаўняга часу яшчэ і важнае звяно праекта новага Шаўковага шляху. Нагадаем і той факт, што ў сілу нядаўна ўступіў пяцідзённы безвізавы рэжым для грамадзян 80 краін. Роля дарог высокая, як ніколі. І калі наконт якасці рэспубліканскіх магістраляў пытанняў амаль не ўзнікае, то з невялікімі рэгіянальнымі ўсё не так проста. Развіццё мясцовых аўтамабільных дарог абмяркоўвалася ўчора на нарадзе ў Палацы Незалежнасці. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу прывесці іх у прымальны стан да 2020 года.**

— У снежні мінулага года падчас адкрыцця другой кальцавой дарогі вакол Мінска мы дамаўляліся, што ў пачатку бягучага года разгледзім, дэтальна прааналізуем праблемныя аспекты развіцця аўтамабільных дарог, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Пытанне не проста наспела, яноераспела — у сілу пэўных прычын.

Як адзначыў Прэзідэнт, апошнім часам удзяляецца вялікая ўвага развіццю сеткі рэспубліканскіх аўтамагістраляў краіны — і гэта натуральна:

— У нейкай ступені пытанні мясцовых дарог адышлі на другі план. Гэта прывяло да з'яўлення справядлівых нараканняў з боку насельніцтва на стан дарожнай сеткі ў рэгіёнах. Па розных ацэнках, ад шасці да дзесяці тысяч кіламетраў дарог патрабуюць неадкладнага рамонту. Трэба мець на ўвазе, што людзі нашы не прывыклі перамяшчацца па дрэнных дарогах.

Мясцовыя органы ўлады, якія кантралююць сетку мясцовых аўтамабільных дарог, спасылаюцца на недахоп сродкаў. У той жа час уявіць сітуацыю, калі літаральна на ўсё будзе дастаткова грошай, амаль немагчыма — не толькі ў нашай краіне, але і ў дзяржавах з самым вялікім у свеце ВУП.

— У гэтай сувязі хачу адразу вас папярэдзіць: сродкаў заўсёды не хапала, нават у савецкія часы, — заявіў Прэзідэнт. — У свой час для вырашэння пытанняў фінансавання дарожных работ урад у дапаўненне да таго, што выдзяляецца з мясцовых бюджэтаў, увёў дзяржаўную пошліну за допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Безумоўна, гэта мізэрныя сродкі ў параўнанні з тымі, якія патрэбны сёння для аднаўлення і рамонту дарог мясцовага значэння.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу выявіць падчас нарады факты, якія прывялі да нездавальняючага стану мясцовых дарог, і знайсці шляхі вырашэння тых праблем, якія ёсць:

— Тэхналогій — больш, чым дастаткова... Прытым трэба мець на ўвазе, што дарогі мы дамовіліся рабіць з бетонным пакрыццём. Калі гэта сёння па-ранейшаму актуальна і выгадна — прынамсі, мне пакуль ні адзін спецыяліст не далажыў, што гэта нявыгадна, — значыць, трэба зрабіць гэтыя дарогі максімальна з бетонным пакрыццём. Дзе гэта немагчыма, значыць, з асфальта-бетонным... Жалезны кантроль за губернатарамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

**❍ У ТЭМУ**

**Анатоль СІВАК, міністр транспарту і камунікацый:**

— Рамонтныя работы мясцовай транспартнай сеткі будуць прадугледжаны адпаведнай дзеючай дзяржпраграмай на пяцігодку. Да гэтага моманту ў нас у праграме былі толькі рэспубліканскія дарогі. Праект праграмы ўжо падрыхтаваны, і тут будуць прапісаны задачы па мясцовых дарогах. Раней мясцовыя дарогі распрацоўваліся рэгіянальнымі праграмамі. Яшчэ ў канцы мінулага года Прэзідэнтам была пастаўлена задача Мінтрансу распрацаваць рашэнні для розных тыпаў дарог і розных відаў рамонту. Такія канструкцыйныя тыпавыя рашэнні распрацаваны. Праз праграму яны будуць узаконены, і прымяненне гэтых рашэнняў дазволіць эфектыўна расходаваць сродкі.

**Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў:**

— На правядзенне капітальнага рамонту і прывядзенне ў парадак мясцовых аўтамабільных дарог у перыяд з 2017 па 2020 год будзе накіравана каля 900 мільёнаў беларускіх рублёў. Гэта сродкі рэспубліканскага дарожнага фонду і мясцовых бюджэтаў. У першую чаргу будуць накіроўвацца сродкі дзяржаўнай пошліны, якая спаганяецца за допуск аўтатранспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Сродкі, якія паступаюць ад збірання дзяржпошліны, складуць прыкладна 40% бюджэту, які выдзяляецца на рамонт дарог.

# ПОГЛЯД З ВЯСКОВАЙ «ВЫСОТКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дзіўна, што сюды не дайшлі супермаркеты, — кажа маладая жанчына, — але ёсць крама мясцовага СВК, дзе можна набыць якасныя мясныя прадукты, якія і ў Гродне добра ведаюць. Часта прадаюць мясцовую агародніну. Вунь яблыкі танныя, па 13 капеек за кілаграм.

Як гаспадыня Каця задаволена, а як маці хацела б бачыць больш дзіцячых пляцовак у «вёсцы будучыні». Наўрад ці яны будуць пуставаць — мамы з дзіцячымі калясканмі на вуліцах Абухава сустракаюцца паўсюдна. У сельскім Савеце расказалі, што якраз днямі яшчэ адна пляцоўка ўладкуецца ў жылым квартале, а ўсяго іх пяць.

Па гарадскіх мерках у Абухаве пачалі жыць яшчэ ў 70-х гадах. Менавіта ў той час было задумана пабудаваць пасёлак, набліжаны да гарадскога асяроддзя. Ва ўзорна-паказальнай вёсцы жыхары пазбаўлены бытавых праблем. Для работнікаў сельскай гаспадаркі адзін за адным выраслі пяці-, шасці- і васьміпавярховыя дамы. У вясковым асяроддзі з'явілася цэлая вуліца шматпавярховікаў. Гэты кірунак працягваецца цяпер. У мінулым годзе гаспадарка засяліла новы 16-кватэрны жылы дом. Праўда, многія высоткі даўно патрабуюць рамонту.

Крыху ў бок ад цэнтральнай вуліцы пачынаецца прыватны сектар. Тамара Іванаўна прыводзіць у парадак свой кветнік. Заўважаю, што ў пасёлку вельмі чыста. Па словах жанчыны, тут заўсёды на вуліцах парадак, а як толькі трошкі прагрэецца зямля, будуць высаджваць паўсюдна кветкі — і самі гаспадары, і камунальныя службы.

— Прыгажосць наводзяць такую, што і горад пазайздросціць, — усміхаецца Тамара Іванаўна. — А вось быт



наш ад эстэтыкі адстае. І газ цэнтральны не ўсюды ёсць, і па медыцынскім абслугоўванні ёсць пытанні.

У мясцовай амбулаторыі чакаюць яшчэ аднаго лекара агульнай практыкі. **Загадчыца Алла ЯНУЛЕВІЧ** новую канцэпцыю развіцця аграгарадка звязвае з рэканструкцыяй сельскай медустановы. Кажа, што патрэбны лабараторны корпус, койкі дзённага стацыянара, некалькі асобных кабінетаў. І ўчастак для гэтага ёсць у двары амбулаторыі, былі б толькі сродкі...

Пакуль генеральны план будучага пасёлка толькі складаецца, паведамілі ў аддзеле архітэктуры і будаўніцтва Гродзенскага райвыканкама, затым пачнецца адвод зямлі. Гэта работа вядзецца сумесна з СВК. Асноўны акцэнт будзе зроблены на будаўніцтва жылля з адпаведнай інфраструктурай — паркоўкамі, дзіцячымі пляцоўкамі, зонай адпачынку. Самым маштабным праектам сёлета можа стаць рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў.

Спыняюся каля спартыўнай школы, дзе аб нечым спрачаюцца трое мужчын, адзін прытрымлівае веласіпед. Для вёскі гэта хутчэй транспарт, чым спартыўны інвентар. Таму пра веладарожкі тут пакуль не задумваюцца. Большая патрэба ёсць у стадыёне. **Дырэктар Мікалай ЯНУШКЕВІЧ** азартна дэманструе ўчастак каля спартыўнай школы, дзе можна гэты аб'ект размясціць:

— Мы даўно гэту ідэю даносім, сюды будуць прыходзіць жыхары Абухава, каб у валейбол, баскетбол згуляць, зімой — каток можна заліць.

У Абухаве ганарацца валейбольнай камандай, якая ўваходзіць у вышэйшую лігу. Мясцовыя спартсмены — валейбаліст і сем барцоў — у складзе нацыянальных зборных краіны. А вось для масавага адпачынку патрэбны вулічныя гульні, многія хацелі б бачыць у аграгарадку аднаўлены басейн.

— Тры гады не працуе, — кажа Мікалай Янушкевіч. — З таго часу як гаспадарка перадала яго на баланс райвыканкама. Пачалі рабіць рамонт, так і стаіць... Раней цэлымі сем'ямі сюды хадзілі...

Як хутка адрамантуюць басейн — невядома. Бо сродкі на развіццё вёскі будучыні прыйдзецца шукаць на месцы — у раёне і СВК.

Затое няма праблем з грамадскай лазняй. Жыхары задаволены, што ў аграгарадку ёсць такі важны сацыяльны аб'ект, і гатовы заплаціць пяць рублёў за добрую пару.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**❍ У тэму**

**Яўген САДОХА, галоўны архітэктар Гродзенскай вобласці:**

— Аграгарадок Абухава — самы іміджавы ў рэгіёне. Па-першае, тут ёсць неабходная інфраструктура, моцны СВК, які забяспечвае развіццё аграгарадка. Па-другое, вакол населенага пункта склалася спрыяльнае асяроддзе. Гэта блізкасць магістралі Гродна — Мінск, аэрапорт, які знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад Абухава, а таксама тэрыторыя Гродзенскай ГЭС, дзе ў далейшым можна развіваць турызм. Дарэчы, план забудовы трох зон ужо распрацаваны.

**Валерый СМАЛЕЙ, старшыня Абухаўскага сельвыканкама:**

— Пакуль невядома, ці будзе ўлічана ў генеральным плане індывідуальнае будаўніцтва. Участкі тут не распрацоўваліся ўжо больш за 10 гадоў, хоць чарга на іх складае 120 чалавек. Атрымаць надзел праз аўкцыён можна толькі ў навакольных вёсках, аднак ахвотных практычна няма. У той жа час у самім Абухаве ёсць прыдатная для забудовы тэрыторыя, продаж якой можа прынесці значныя сродкі ў раённы бюджэт.

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ ПРЫСУДЖАНЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2016 года», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У галіне навукі і тэхнікі прэмія прысуджана за распрацоўку і ўкараненне тэхналогій трансплантацыі органаў у дзяцей і дарослых супрацоўнікам 9-й гарадской клінічнай бальніцы і Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Алегу Румо, Юрыю Астроўскаму, Аляксандру Дзядзько, Алегу Калачыку, Аляксею Шчэрбе, Андрэю Валенцюкевічу.

За распрацоўку і арганізацыю прамысловай вытворчасці экспартна арыентаваных мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння на аснове стварэння сучасных метадаў праектавання, паўправадніковых тэхналогій і высокадакладнага аналітычнага і зборачнага абсталявання прэміі ўдастоены супрацоўнікі ААТ «Інтэграл» Віталь Саладуха, Сяргей Чыжык і Сяргей Шведаў, ААТ «Планар» — Валерый Зайцаў і Генадзь Кавальчук, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — Сяргей Грабчыкаў.

У галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прэмія прысуджана калектыву супрацоўнікаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі ў асобе Аксаны Волкавай, Настассі Масквіной, Станіслава Трыфанава, Сяргея Франкоўскага, Ніны Ламановіч, Аляксандра Касцючэнкі за значныя творчыя дасягненні ў развіцці музычнага мастацтва, прапаганду духоўных каштоўнасцяў і значны асабісты ўклад у пастаноўку опернага спектакля на музыку Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда» паводле твора Уладзіміра Караткевіча.

За значныя дасягненні ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтва, стварэнне музыкі да балета «Мефіста», мюзіклаў «Шклянка вады», «Джулія», «Соф'я Гальшанская», «Байкер» прэміі таксама ўдастоены кампазітар Уладзімір Кандрусевіч.

Названыя работы з'яўляюцца адлюстраваннем найважнейшых і найлепшых дасягненняў нашай краіны ў сферах навукі і тэхнікі, мастацтва і культуры.

## ❍ Слова — лаўрэатам дзяржпрэміі

**Сяргей ГРАБЧЫКАЎ, галоўны навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання Навукова-практычны цэнтр па матэрыялазнаўстве НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук:**

— Дзяржаўная прэмія — гэта своеасаблівы вынік велізарнага этапу ў маім жыцці і 40 гадоў працы ў Нацыянальнай акадэміі навук. Відаць, усё гэта было нездарма — плён для краіны ёсць. Высокай адзнакі заслужыла наша сумесная комплексная распрацоўка з ААТ «Інтэграл» і ААТ «Планар» па прамысловай вытворчасці мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння. Яны будуць выкарыстоўвацца ў ракетна-касмічнай, авіяцыйнай, ваеннай, атамнай тэхніцы, а таму павінны адпавядаць вельмі высокім патрабаванням па трываласці пад уздзеяннем самых розных дэстабілізуючых фактараў. «Інтэграл» распрацаваў каля 230 новых вырабаў, якія выкарыстоўваюцца пераважна расійскім ВПК. «Планар» стварыў зборачнае абсталяванне, без якога вытворчасць была б немагчымая. Акадэмія навук займалася навуковым забеспячэннем (напрыклад, прапанавала новыя матэрыялы для абароны ад розных відаў выпраменьвання) і аналітыкай — вырабы з праектнымі нормамі меншымі за мікраметр патрабуюць адпаведных метадаў кантролю, такіх як атамна-сілавая мікраскапія.

* * *

**Аляксей ШЧЭРБА, загадчык аддзела трансплантологіі РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак 9-й гарадской клінічнай бальніцы:**

— Мы распрацавалі тэхналогіі папярэджвання, дыягностыкі і лячэння парушэнняў функцыі печані, звязаных з трансплантацыяй. Варта заўважыць, што перасадка ў гэтым выпадку заўсёды суправаджаецца больш ці менш выражаным часовым пагаршэннем функцыі перасаджанага органа. А звязана гэта з бяскроўным перыядам, калі на працягу некалькіх гадзін да аперацыі печань знаходзіцца без кровазвароту, ва ўмовах кансервацыі. Нашы тэхналогіі ўключаюць прымяненне асаблівага віду інгаляцыйных анестэтыкаў, спецыяльных лекавых сродкаў, сучасных спосабаў марфалагічнай і малекулярна-генетычнай дыягностыкі. Усе нашы тэхналогіі заслужылі прызнанне на міжнародных форумах, прысвечаных трансплантацыі печані і нырак, у тым ліку даследаванне генетычных перадумоў таго, як орган перанясе бяскроўны перыяд. Тэхналогія лекавай абароны трансплантуемай печані прайшла ўсе этапы міжнароднай рэгістрацыі. У еўрапейскім і амерыканскім цэнтрах была атрымана станоўчая ацэнка і на этапе планавання, і на этапах даследавання і ўкаранення. Акрамя таго, удалося стварыць перадавую па сутнасці і выніках праграму гепатабіліярнай хірургіі. Наогул трансплантацыя і хірургія печані пазітыўна паўплывалі на развіццё адна адной. Урэшце мы стварылі сучасную сістэму трансплантацыі печані, гепатабіліярнай хірургіі, што існуе толькі ў высокаразвітых краінах накшталт Германіі і ЗША.

* * *

**Уладзімір КАНДРУСЕВІЧ, кампазітар:**

— Работы, за якія мяне адзначылі, — гэта ўсё маё жыццё. Я не чакаў гэтай прэміі, але вельмі прыемна, што судзяць па выніках, а не па другасных дасягненнях. Напрыклад, па знакавай для мяне рабоце «Соф'я Гальшанская» — гэта адна з апошніх маіх пастановак, я вельмі доўга да яе ішоў. Недзе ў 2006 годзе прыехаць прывёз мне памятную манету, якую Нацыянальны банк выпусціў да 600-годдзя ад нараджэння Соф'і Гальшанскай. Ён сказаў мне, маўляў, «паглядзі, можа, нешта зацікавіць». І я стаў працаваць, Алена Турава напісала лібрэта, доўгі час мы падбіралі састаў, знайшлі, у тым ліку, Вольгу Жалезскую, у выкананні якой польская каралева атрымалася пяшчотнай і ласкавай. У мяне даўняе сяброўства з Музычным тэатрам і канкрэтнымі выканаўцамі, напрыклад, з Наталляй Гайдай, для якой я напісаў свой першы мюзікл «Джулія». Потым была «Шклянка вады», якая, дарэчы, ідзе на сцэне ўжо дваццаць другі сезон. З некаторымі тэатрамі я прайшоў усё сваё творчае жыццё, у Беларусі я, напэўна, працаваў з усімі значнымі рэжысёрамі. Маю блізкія па духу сувязі з тэатрамі ў Расіі: летась, напрыклад, я працаваў там над двума спектаклямі.

* * *

**Ніна ЛАМАНОВІЧ, народная артыстка Беларусі, галоўны хормайстар Вялікага тэатра оперы і балета:**

— У нашым тэатры заўсёды ставіліся вартыя оперы беларускіх кампазітараў — Яўгена Цікоцкага, Анатоля Багатырова, Яўгена Глебава, бо Вялікі тэатр — нацыянальны, і праца з беларускай класікай з'яўляецца нашым маральным абавязкам. «Сівая легенда», за якую цэлы калектыў атрымаў Дзяржаўную прэмію, — гэта наша гісторыя, наша мова, наша музычная і сцэнічная культура. Аўтарам лібрэта з'яўляецца Уладзімір Караткевіч, кампазітарам стаў Дзмітрый Смольскі, у групу ўвайшлі вядучыя салісты — гонар тэатра, тут шчыльна заняты хор, хормайстры і галоўны мастак Аляксандр Касцючэнка. Гэта опера з'явілася ў Вялікім ужо другі раз, але ў цалкам іншай рэдакцыі. «Сівая легенда» ідзе на беларускай мове, тут вельмі яскравае сцэнічна-музычнае ўвасабленне, яна глядзіцца на адным дыханні. Оперны тэатр у нашай краіне адзін, і «Сівой легендай» мы можам ганарыцца: любая краіна, канешне, ганарылася б пастаноўкай такога ўзроўню.

# ...ПАДАРОЖЖЫ НА ПЛАТАХ І БАЛОТАХОДАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

Зараз жа самы час выправіцца на канцэрты птушынага аркестра — на ахоўваемых тэрыторыях вясной ладзяць экскурсіі на глушцовыя такавішчы. Можна пахваліцца, што з мінулага года ў заказніку «Налібоцкі» пачала працаваць і глушцовая ферма, дзе спрабуюць штучна разводзіць рэдкіх птушак.

У той час як некаторыя ахоўваемыя тэрыторыі ўжо актыўна завабліваюць турыстаў і зарабілі сабе добрую рэпутацыю, іншым заказнікам яшчэ неабходна папрацаваць на свой імідж. Перспектыўнымі для развіцця экатурызму, па словах Мікалая Свідзінскага, з'яўляюцца 39 аб'ектаў. Справа за тым, каб падабраць добрых спецыялістаў, якія будуць іх «раскручваць». Між іншым, ужо створаны 24 дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстановы, якія здзяйсняюць кіраўніцтва 26 заказнікамі рэспубліканскага значэння.

## Ляснымі сцежкамі

Самая першая экалагічная сцежка была створана ў заказніку «Спораўскі». Сёння падобныя пазнавальныя маршруты пракладзены на многіх прыродаахоўных аб'ектах. Пракладзеныя экасцежкі могуць праходзіць праз розныя тыпы лесу, балота! Падчас падарожжа па іх людзі знаёмяцца з багатым прыродным і жывёльным светам, затрымліваюцца каля дэманстрацыйных вальераў з дзікімі жывёламі. Як запэўніў прадстаўнік Міністэрства лясной гаспадаркі Сяргей Шастакоў, такі кірунак будзе развівацца і надалей: «Сумесна з Акадэміяй навук па нашых рэгіёнах мы вывучалі гісторыка-культурныя каштоўнасці і на падставе гэтага вырашалі, дзе трэба развіваць экасцежкі».

Дарэчы, сёлета ў Налібоцкім заказніку пачне дзейнічаць унікальная экалагічная сцежка — для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Яе пакрыццё зроблена такім чынам, каб па ім магла праехаць інвалідная каляска.

## Турызм без межаў

Трэба сказаць, што колькасць турыстаў з кожным годам павялічваецца. Толькі летась, у параўнанні з 2015 годам, прырост склаў 130 працэнтаў. Паступова набіраюць папулярнасць трансгранічныя падарожжы. Падобныя экамаршруты створаны ў Белавежскай пушчы. Турыст, які знаёміцца з запаветнай беларускай прыродай, можа прагуляцца і па польскай частцы пушчы. Для іншаземных гасцей, якія прыбылі ў наш Нацыянальны парк, на працягу трох дзён дзейнічае бязвізавы рэжым. Акрамя таго, сёння ў замежнікаў ёсць магчымасць наведаць Беларусь без візы праз Нацыянальны аэрапорт. Таксама без віз турысты могуць патрапіць на Гродзеншчыну: у вобласці існуюць спецыялізаваныя прапускныя пункты для такіх падарожнікаў.

Разглядаюцца пытанні аб увядзенні бязвізавага рэжыму для аматараў дзікай прыроды, якія будуць рухацца па міжнародных экамаршрутах «Котра—Чапкяляй», «Рычы—Сіленэ», «Браслаўскія азёры — Аўгшдаугава».

У хуткім часе падарожнікі змогуць выправіцца і па новым міжнародным маршруце працягласцю ў 500 кіламетраў. У лютым было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж асабліва ахоўваемымі тэрыторыямі Беларусі і Асацыяцыяй запаведнікаў і нацпаркаў Расіі, і цяпер вядзецца работа па стварэнні трансгранічнага маршруту «Па запаветных мясцінах Паазер'я». У яго будуць уключаны тэрыторыі адразу некалькіх нацыянальных паркаў («Браслаўкія азёры», «Нарачанскі», «Смаленскае Паазер'е», «Себежскі») і Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

❍ Тым часам

### ЧАС ЗНАХОДЖАННЯ ТУРЫСТАЎ ПЛАНУЕЦЦА ПАВЯЛІЧЫЦЬ

З 12 лютага магчымасцю наведаць Беларусь без візы скарысталіся 8 тысяч чалавек. Па словах **міністра спорту і турызму Аляксандра ШАМКО**, ужо сёння можна гаварыць пра станоўчую дынаміку. Цяпер замежнікі, якія прыбываюць цераз Нацыянальны аэрапорт, могуць знаходзіцца без віз у нашай краіне на працягу 5 сутак. «Сёння бачна, што тэрмін знаходжання турыстаў трэба павялічваць, — заўважыў міністр. — Відавочна, што мы павінны зрабіць гэту сістэму больш гнуткай і не прывязвацца да 5 дзён». Карэкціроўкі плануецца ўвесці да канца гэтага года. Безумоўна, трэба ўлічваць тое, што турысты наведваюць Беларусь з рознымі мэтамі. Так, фестывалі затрымаюць гасцей у Беларусі на больш працяглы час. Людзям, што папраўляюць здароўе ў беларускіх санаторыях, можа не хапіць і двух тыдняў. Лішнія дні могуць спатрэбіцца нават і тым, хто прыехаў на бізнес-форумы, каб пасля дзелавых сустрэч паспець пазнаёміцца і з самой краінай, яе цудоўнымі мясцінамі.

■ Бяспека

## Месцы набажэнстваў праверацць сапёры

### Як будуць ахоўваць грамадскі парадак у дні рэлігійных свят

**На гэты красавік выпала адразу тры вялікія святы: Вербная нядзеля і Вялікдзень, якія сёлета будуць адзначацца 9 і 16 чысла адпаведна як праваслаўнымі, так і каталікамі, і праваслаўная Радаўніца — 25 красавіка. У гэтыя дні ў месцах масавага збору людзей супрацоўнікі органаў унутраных спраў традыцыйна ўзмоцняць ахову.**

Асаблівую ўвагу планецца ўдзяліць пытанням асабістай, маёмаснай і дарожнай бяспекі грамадзян. Месцы набажэнстваў і прылеглую да іх тэрыторыю загадзя будуць аглядаць спецыялісты сапёрна-піратэхнічных груп. Калі ўзнікне неабходнасць, будзе арганізавана ачапленне і пропускны рэжым з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў.

**Начальнік упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Аляксандар ЖЫЛІНСКІ** паведаміў, што з-за павелічэння пасажырапатоку ў выхадныя і святочныя дні пад пільнай увагай будуць аб'екты транспарту. Дзяржаўтаінспекцыя ўжо распрацавала маршруты аб'езду месцаў правядзення масавых мерапрыемстваў. Для забеспячэння камфорту аўтааматараў, будуць арганізаваны ва ўзаемадзеянні з камунальнымі службамі ідзе падрыхтоўка зручных паркавачных месцаў.

Міністэрства ўнутраных спраў заклікае грамадзян быць пільнымі: своечасова інфармаваць найбліжэйшыя міліцэйскія нарады аб падазроных асобах альбо пакінутых без нагляду прадметах.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## ПАМЯЦІ КАЛМЫЦКАГА ПАЭТА

**У Беразіно плануюць усталяваць мемарыяльную дошку ў знак памяці калмыцкага паэта Міхаіла Ханінава.**




Аўтар паэмы пра Хатынь, многіх вершаў, прысвечаных Беларусі, партызаніў у гэтых мясцінах. Часта зазіраў на Міншчыну і Магілёўшчыну і ў пасляваенныя гады, калі вярнуўся разам са сваім народам са сталінскай дэпартацыі. І яго, кавалера ордэна Чырвонага сцяга, не абмінула доля сваіх землякоў. А вярнуўшыся ў Элісту, шмат працаваў. У Мінску пабачылі свет дзве кнігі калмыцкага паэта на беларускай мове. Сярод перакладчыкаў — Аляксей Пысін, Рыгор Барадулін, Алесь Бачыла...

Ініцыятар усталявання памятнай дошкі, фундатар мемарыяльнага праекта — дачка пісьменніка: вядомы ў Калмыкіі і Расіі літаратуразнаўца, перакладчык, паэт Рыма Ханінава. Яна асабіста шмат робіць дзеля ўшанавання памяці пра бацьку. Мяркуецца, што мемарыяльная дошка з'явіцца ў Беразіно напярэдадні сёлетняга Дня беларускага пісьменства.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Будзь у курсе

## КАБ НЕ ТРАПІЦЬ У БЯДУ — ПАЗВАНІ

### Уводзіцца дадатковы нумар для інфалініі па бяспечным выездзе за мяжу

**Акрамя кароткага нумара 113, прызначанага для бясплатных званкоў са стацыянарных тэлефонаў, будзе дзейнічаць нумар для абанентаў мабільнай сувязі 7113. Паслуга аплачваецца па тарыфах мабільных аператараў.**

— Мы стараемся выкарыстоўваць усе тэхналогіі, каб дапамагчы беларусам хутка атрымаць неабходныя звесткі, звязаныя са знаходжаннем за мяжой, — кажа **кіраўнік праграмы «Ла Страда Беларусь» Алена НЕСЦЯРУК.** — Вельмі важна, каб яшчэ да ад'езду чалавек мог даведацца аб правілах легальнага працаўладкавання ў пэўнай краіне, аб тым, што павінна быць прапісана ў кантракце і як у цэлым зрабіць бяспечным свой выезд за мяжу.

Звязацца са спецыялістамі інфалініі можна таксама з дапамогай анлайн-кансультавання на сайце www.lastrada.by. Гэты фармат быў уведзены ў сакавіку мінулага года і стаў вельмі папулярным: 50 працэнтаў зваротаў у праграму «Ла Страда» паступілі менавіта праз анлайн-сэрвіс.

У цэлым з пачатку года на інфалініі зафіксавана больш за 1,3 тысячы запытаў. Прыярытэтнай тэмай у абанентаў, як і ў папярэднія гады, застаецца працаўладкаванне за мяжой — 38,6 працэнта зваротаў. Асаблівасці пашпартна-візавага рэжыму цікавяцца 13,9 працэнта патэнцыйных мігрантаў, сямейна-шлюбнымі адносінамі з замежнымі грамадзянамі — 7,8. Пытанням іміграцыі прысвечана 5,5 працэнта кансультацый, навучання — 4,3.

Адзін з асноўных кірункаў праграмы — аказанне дапамогі грамадзянам, якія трапілі ў бяду ў чужой краіне. Летась 2,1 працэнта запытаў былі звязаны менавіта з крызіснымі сітуацыямі.

Што датычыцца геаграфіі, то ў зваротах часцей за ўсё фігуруюць такія краіны, як Польшча (17,4 працэнта), Расія (14,7), Германія (9,3), Італія (6,8), Ізраіль (4,2).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Рэйтынг Трампа зменшыўся да абсалютнага мінімуму

Як паказала апытанне даследчай службы ўніверсітэта Куініпэк, толькі 35% рэспандэнтаў станоўча ацэньваюць працу Трампа на найвышэйшай дзяржаўнай пасадзе, у той час як 57% адазваліся пра яе ў негатыўным ключы. Рэйтынг цяперашняга гаспадара Белага дома ніжэй за найменшы ўзровень адабрэння работы Абамы ў 2013 годзе, які складаў 38%.

### Меляншон выступіў за выхад Францыі з ЕС



Кандыдат у прэзідэнты Францыі ад руху «Няскораная Францыя» Жан-Люк Меляншон лічыць, што будучыня краіны знаходзіцца па-за рамкамі Еўрапейскага саюза. Пра гэта ён заявіў на тэледэбатах усіх 11 кандыдатаў на найвышэйшы палітычны пост. «Недапушчальна, каб з Брусе, нам надыктоўвалася, якія сацыяльныя і эканамічныя пераўтварэнні варта праводзіць у краіне», — сказаў прадстаўнік левых сіл.

### Войскі Паўднёвай Карэі знаходзяцца ў поўнай баегатоўнасці

Гэта зроблена дзеля таго, каб даць адпор КНДР у сувязі з апошнімі ракетнымі выпрабаваннямі Пхеньяна, гаворыцца ў распаўсюджанай заяве аб'яднанага камітэта начальнікаў штабоў Узброеных сіл Рэспублікі Карэя. Як вядома, новае ракетнае выпрабаванне КНДР было праведзена ў раёне населенага пункта Сінпхо. Ракета праляцела каля 60 кіламетраў у бок Японскага мора і дасягнула максімальнай вышыні палёту ў 189 км.

### Уведзены ў абарачэнне новы банкнот наміналам 50 еўра

Еўрапейскі цэнтрабанк афіцыйна ўвёў у абарачэнне новы банкнот наміналам 50 еўра з серыі «Еўропа», які абаронены ад падробак вадзяным знакам. З 2013 года ўведзены ў абарот абноўлены купюры меншага наміналу. Банкноты наміналам 100 і 200 еўра з серыі «Еўропа» будуць выпушчаны праз два гады. А налета ЕЦБ спыняе выпуск банкнотаў наміналам 500 еўра.

■ Здарэнне

## 40 тон металалому за адны суткі

### выключылі з незаконнага абароту гомельскія міліцыянеры ў выніку двух буйных затрыманняў



На аўтадарозе «РФ — Гомель — Кобрын» ноччу з 2 на 3 красавіка інспектары дарожна-паставой службы разам з калегамі з Добрушскага РАУС спынілі аўтамашыну «МАН», напоўненую ломам чорнага металу. У 35-гадовага кіроўцы дакументаў на груз не было, але ён растлумачыў, што ўсё прызначалася для продажу на тэрыторыі Расіі. Як расказаў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь ПРЫСТРОМАЎ, кантрабанда вагой 20 тон дастаўлена ў Добрушскі РАУС**, дзе ў адносінах да ўладальніка вядзецца адміністрацыйны працэс.

Яшчэ 20 тон чорнага металу супрацоўнікі спецпадраздзялення Дзяржаўтаінспекцыі «Маланка» і АМАП УУС затрымалі тым жа днём недалёка ад вёскі Стаўбун Веткаўскага раёна. 25-гадовы кіроўца грузавіка «МАЗ», жыхар вёскі Пакалюбічы, сказаў, што аўтамашына належыць аднавяскоўцу. Той, у сваю чаргу, растлумачыў, што збіраў метал каля сваёй вёскі і папрасіў знаёмага даставіць тавар у нарыхтоўчы пункт на расійскай тэрыторыі. Суправаджальныя дакументы ўладальнік тавару прад'явіць таксама не змог. Як і ў першым выпадку, аўтамабіль і груз затрыманы, праводзяцца неабходныя праверкі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# МІСІЯ: ПАСАДЗІЦЬ ДРЭВА

**Вялікая колькасць дэпутатаў прыняла ўдзел у акцыі «Тыдзень лесу — 2017»**

У рамках добраахвотнай акцыі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў адправіліся пад вёску Пекалін Смалявіцкага раёна. У мінулым годзе стыхія сур'ёзна пашкодзіла мясцовыя лясныя ўгоддзі.

— Лясгасы наступствы ўжо ліквідавалі, драўніна цалкам вывезена. Цяпер асноўная работа — пасадка лесу, — падкрэсліў **намеснік міністра лясной гаспадаркі Беларусі Аляксандр КОРБУТ.** — Міністэрства лясной гаспадаркі запрашае ўсіх ахвотных на пасадку лесу: 15 тысяч гектараў, якія былі ў мінулым годзе пашкоджаныя, павінны быць адноўленыя.


Фота БЕЛТА.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК і намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК прынялі ўдзел у акцыі.**

Па словах намесніка міністра, мінулай восенню былі адноўлены больш як 5 тысяч гектараў, а плануецца яшчэ 6 тысяч. Сіламі дэпутатаў за адзін дзень дрэўцамі засадзілі 10 гектараў.

Неабходнасць правядзення акцыі «Тыдзень лесу — 2017» падкрэсліў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Баляслаў ПІРШТУК.** «Мы ведаем, што больш за 40% нашай тэрыторыі займае лес. На жаль, летась стыхія прынесла нам шмат страт, — дадаў парламентарый. — Лес — гэта не толькі сыравінны матэрыял для эканомікі, але і экалагічны прадукт, які разам з нашымі балотамі з'яўляецца «лёгкімі» Еўропы. Таму для нас, безумоўна, вельмі важна аднавіць гэты баланс».

— У гэтым годзе ў нас, напэўна, самая шматлікая акцыя за ўсе гады ўдзелу дэпутатаў. Усяго тут каля 90 парламентарыяў, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК.** — Акцыя накіравана на прапаганду руплівых адносін грамадскасці да нашых лясоў. Лясы — гэта наша нацыянальнае багацце.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Дэпутацкія развагі

# УРОК ДЫЯЛОГУ

**Мы ўсе як грамадзяне краіны з'яўляемся падаткаплацельшчыкамі і мусім сплачваць падаткі, калі маем прыбытак. Так робіцца ва ўсім свеце. Разам з тым ёсць пэўная група людзей, якія не хочуць выплочваць падаткі, нягледзячы на тое, што яны маюць даходы, часта немалыя, працуючы без афіцыйнага афармлення, або наўпрост утойваючы сапраўдны памер прыбыткаў. Менавіта на іх найперш і павінна было быць накіравана дзеянне Дэкрэта №3, выкананне якога стала адным з самых вострых пытанняў апошніх месяцаў.**



Разам з тым нямала людзей як у вялікіх гарадах, так і ў сельскіх населеных пунктах не маюць магчымасці ўладкавацца на работу па спецыяльнасці з больш-менш адэкватным заробкам, спрабуюць шукаць працу самастойна ці перабіваюцца нейкімі падпрацоўкамі. На біржы яны ў свой час не рэгістраваліся, бо не бачылі сэнсу, а сітуацыя на раённым узроўні дапаўняецца яшчэ і транспартнымі праблемамі — складанасцю (фінансавай у тым ліку) дабірацца да раённага цэнтра, каб рэгулярна адзначацца ці выконваць грамадскія работы.

Трэба назваць і традыцыйную для ўсіх грамадстваў катэгорыю так званых «хатніх гаспадынь». Паводле Дэкрэта яны павінны рабіць вызначаныя выплаты. Але ж мы забываемся на тое, што гэтыя жанчыны не карыстаюцца такім правам, як аплата бальнічнага, як правіла, дзеці ў такіх сем'ях хварэюць менш, а значыць, і тут ёсць эканомія бюджэтных сродкаў.

Неабходна асобна выдзеліць яшчэ адну значную групу жыхароў, якія падпадаюць пад дзеянне Дэкрэта. Гэта тыя, хто працу зрэдку ці не працуе зусім, бо мае алкагольную (ці наркатычную) залежнасць.

Адносіны і падыходы да кожнай з гэтых (не ўсіх, а толькі асноўных) груп не могуць быць аднолькавыя.

Так, у першым выпадку выяўляць людзей, якія не жадаюць аплачваць падаткі з сваіх даходаў, але карыстаюцца рознымі правамі, набываюць даволі дарагія рэчы, будуюць шыкоўныя дамы — найпершая задача падатковай інспекцыі. І так робіцца ва ўсім свеце.

Што датычыцца іншых груп, то да іх павінна быць і іншае стаўленне. Як на маю думку, дэкларуючы сацыяльную скіраванасць дзяржавы, варта даць магчымасць тым, хто жадае, займацца хатняй гаспадаркай да дасягнення дзецьмі ўзросту 14 гадоў. Гэта норма ў свой час была ўведзена, бо менавіта да 14 гадоў маці давалі бальнічны па доглядзе за дзіцем.

Для тых, хто спрабуе, але не можа самастойна знайсці працу, трэба прадугледзець механізм самазанятасці, як гэта дзейнічае ў выпадку з рамеснікамі і фатографамі, што выплачваюць вызначаны фіксаваны падатак на права займацца дзейнасцю і аказваць адпаведныя паслугі. Ва ўмовах сучаснай эканамічнай сітуацыі і ў сілу асабістых абставін не кожны чалавек можа зарэгістраваць ІП, прафесійна весці бухгалтэрыю і іншую дакументацыю, але можа аказваць паслугі рознага характару: рамантаваць аўто, працаваць цырульнікам дома, дапамагаць у апрацоўцы зямельных надзелаў і г. д. Такіх людзей трэба заахвоціць урэгуляваць адносіны з дзяржавай прымальным даступным спосабам.

Датычна групы людзей, якія маюць алкагольную залежнасць. Гэта адно з самых балючых пытанняў як асабістага, так і агульнадзяржаўнага маштабу. Некалькі гадоў таму мой папярэднік у Палаце прадстаўнікоў Мікалай Іванчанка правёў у нашай выбарчай акрузе значную работу, звязаную з праблемай алкагалізацыі насельніцтва. Адбылося пасяджэнне круглага стала, вынікі былі агучаны ў Палаце прадстаўнікоў, сфармуляваны досыць радыкальныя прапановы ўраду краіны. На жаль, не дайшла справа да парламенцкіх слуханняў па гэтай тэме.

Сёння, у адпаведнасці з Дэкрэтам №3, шматлікая колькасць алкагольназалежных людзей знаходзіцца ў спісе непадаткаплацельшчыкаў, верагоднасць іх паспяховага працаўладкавання і сацыялізацыі мізэрная. Мала таго, значная сума расходаў выпадае на абслугоўванне іх у медыцынскіх установах, дзяцей з такіх сем'яў забіраюць у прытулкі, што зноў жа цягне за сабой расходы з бюджэту, на глебе сацыяльнай неўладкаванасці адбываецца крымінальныя здарэнні і г. д. Таму, на маю думку, з улікам дзейнасці Дэкрэта №3 трэба вярнуцца да згаданых вышэй дакументаў, якія былі напрацаваны ў плане дэалкагалізацыі насельніцтва нашай краіны. Фактычна, мы мусім прыняць агульнадзяржаўную праграму, каб спыніць працэс поўнага разбурэння вясковага побыту і ўцягванне моладзі ў багну алкагалізму. (Акцэнтую менавіта на вяскоўцах, бо ў апошнія гады пашыраецца тэндэнцыя да перасялення адзінокіх алкагольназалежных людзей з гарадоў менавіта ў вёскі, але праграма павінна распаўсюджвацца на гэту мэтавую групу па ўсёй краіне.) А пасля распрацоўкі апрабаваць яе варта ў нейкім асобным раёне з мэтай удасканалення.

Безумоўна, я не пералічыла ўсе магчымыя варыянты жыццёвых сітуацый, якія трэба прадугледзець у адпаведным заканадаўчым акце, маючы сёння досвед яго прымянення.

Што яшчэ хачу адзначыць з непасрэднага ўдзелу ў дзейнасці камісіі па вырашэнні пытанняў, звязаных з выкананнем Дэкрэта №3, гэта значную работу па ўдасканаленні базы звестак па грамадзянах, удакладненні іх месцазнаходжання і фактычнай ацэнцы іх маёмаснага становішча, якую праводзяць дэпутаты мясцовых Саветаў сумесна з прадстаўнікамі выканаўчай улады. Другое, што варта прызнаць як станоўчы факт: члены камісіі (не ўсе, але большасць) становяцца на бок грамадзян і вызваляюць ад выплаты збору, калі ёсць заява і любая нагода аб прызнанні цяжкіх жыццёвых абставін. Тым самым менавіта на мясцовым узроўні можа адбыцца аднаўленне даверу да ўлады, калі ёсць разуменне сітуацыі, падтрымка людзей, дапамога ў іх сацыялізацыі і працаўладкаванні. Калі ж падчас гэтай справы будуць адбывацца несправядлівыя рэчы, накшталт пратэкцыянізму ці неабгрунтаванага ўціску, то гэта толькі паглыбіць тую расколіну, якая сёння назіраецца ў нашым грамадстве. У цэлым гэта сацыяльная ўзрушанасць, якая даўно выспявала і час ад часу пра сябе нагадвала, падштурхоўвае да асэнсавання таго, што трэба мяняць унутраную палітыку з мэтай забеспячэння элементарных правоў людзей, у тым ліку права на свабоду слова. Гэта тэма для далейшых размоў і абмеркаванняў на ўсіх узроўнях: ад мясцовага да агульнадзяржаўнага.

**Алена АНІСІМ,**
**дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Стаўбцоўскай выбарчай акрузе №70**

■ Меркаванне



# ЯК АДРЭАГУЕ ЗАХАД?

**Можна казаць, што сустрэча ў мінулы панядзелак двух Прэзідэнтаў — Беларусі і Расіі — дазволіла вырашыць усе праблемы ў двухбаковых адносінах. Дасягнуты дамоўленасці па цэнах на газ і змяненні газавай формулы, неўзабаве будуць аднаўлены пастаўкі нафты ў ранейшым аб'ёме для нафтаперапрацоўчай галіны Беларусі. Ёсць сур'ёзны шанц на тое, што ў 2018—2019 гадах газавая праблема не будзе больш бударажыць адносіны дзвюх краін, паколькі цана стане намнат больш разумнай для беларускіх спажыўцоў.**

Сітуацыя нагадвае тую, што была ў 2010 годзе. На працягу некалькіх гадоў перад гэтым нарастаў клубок супярэчнасцяў. Глыбока трывожылі цукровыя і малочныя войны, а пачатак 2010 года адзначыўся для Беларусі такімі высокімі цэнамі на нафту, што яны не дазволілі купіць чвэрць звыклага аб'ёму расійскай нафты з-за адсутнасці рэнтабельнасці ў яе перапрацоўцы. Але затым, па ініцыятыве расійскага боку, 9—10 снежня адбыліся перагаворы ў Маскве, па выніках якіх два Прэзідэнты вырашылі ўсе спрэчныя пытанні.

У той раз рэзкае паляпшэнне адносін з Расіяй азначала для Беларусі рэзкае пагаршэнне адносін з Захадам, які быў вельмі расчараваны ўмацаваннем беларуска-расійскіх адносін. Падзеі 19 снежня былі выкарыстаны для дэманізацыі беларускага кіраўніцтва, увядзення санкцый і жорсткіх заяў у адрас Беларусі па ўсіх франтах. Як будуць развівацца падзеі гэтым разам?

Імавернасць чарговага жорсткага сцэнарыя ў адносінах з Захадам не выключана. Занадта ўжо вялікі напал жарсцяў у дачыненні да Расіі з-за ўкраінскага крызісу і паспяховай ролі Расіі ў сірыйскім урэгуляванні, якая парушае планы асобных заходніх краін па адхіленні Асада ад улады. Расію на Захадзе многія ўспрымаюць у якасці заклятага ворага, і гэта стаўленне можа быць распаўсюджана на тыя краіны, якія дэманструюць з ёй цёплыя адносіны.

У той жа час не ўсё так безнадзейна, як было ў 2010 годзе. Ёсць новыя фактары, якія могуць не дапусціць адкату адносін Беларусі з заходнімі краінамі па сцэнарыі 2010 года.

Першы з іх — дзіўныя адносіны ЗША з ЕС. Калі ў 2010 годзе заходні свет быў згуртаваны, а многія еўрапейскія лідары душы не чулі ў Бараку Абаме, які адказваў ім узаемнасцю, то ў 2017 годзе ўсё інакш. Прыход да ўлады Дональда Трампа ў ЗША збліта ўсе звыклыя фарматы адносін амерыканцаў з ЕС. Мноства заяў Трампа як у перыяд выбарчай кампаніі, так і ў першыя месяцы прэзідэнцтва дастаткова непрыемныя як для ЕС, так і для перспектыў цеснага супрацоўніцтва ЗША з ЕС у найбліжэйшыя гады. Чаго вартая хоць бы апошняя сварка з прычыны захапленняў Трампа ў дачыненні да брэксіту, выражаных у заяве прэс-сакратара Белага дома ЗША Шона Спайсера, які падкрэсліў, што Трамп «у свой час узначаліў заклік да правядзення брэксіту і цалкам паважае волю брытанскага народа». У адказ на падобныя заявы старшыня Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер заявіў: «Новы прэзідэнт ЗША радаваўся такой падзеі, як брэксіт, і перакананае іншыя краіны пайсці па тым жа шляху. Што ж, калі ён працягне ў тым жа духу, я сам буду прасоўваць незалежнасць, напрыклад, штата Агая або Тэхас». Дзіўныя адносіны ЗША з ЕС азначаюць для Беларусі значна меншую магчымасць скаардынаванасці ў жаданні пакараць Мінск за цёплыя адносіны з Масквой.

Другім фактарам з'яўляецца зацягнуты працэс урэгулявання ўкраінскага крызісу. Ваенныя дзеянні ў Данбасе то ўспыхваюць зноў, то заціхаюць, але ўкраінскі фактар ніхто не гатовы скідваць з рахункаў. Таму фактар Беларусі застаецца важным для спроб урэгулявць украінскую сітуацыю адразу па двух параметрах. Першы з іх — неабходнасць праводзіць пастаянныя перагаворы ў Мінску, якія ўжо даказалі сваю выніковасць у мінулыя гады. Пошук новых фарматаў можа абярнуцца павелічэннем наяўных праблем, у чым многія на Захадзе не зацікаўлены. Другім параметрам з'яўляецца статус беларускай тэрыторыі, якая мяжуе з Украінай. Цяпер яна з'яўляецца нейтральнай пляцоўкай, адкуль няма ніякіх пагроз для суверэнітэту Украіны. У інтарэсах Захаду захаванне такой сітуацыі, а гэта азначае, што нельга занадта ўскладняць адносіны з Мінскам.

Трэці фактар просты — у снежні 2010 года Захад згуляў у гульню па рэзкім пагаршэнні адносін з Беларуссю. На некалькі гадоў пагоршыўшы адносіны з Мінскам, ніякіх пераваг для сябе ў выніку ён не атрымаў. Ці ёсць сэнс гуляць у гульні, у якіх твае намаганні не апраўдваюцца?

Гэтыя фактары даюць надзею на тое, што ў новай сітуацыі паляпшэння расійска-беларускіх адносін расчараваны Захад абмяжуецца славеснай рыторыкай і не стане рабіць тыя рэзкія крокі, якія здзейсніў у снежні 2010 — студзені 2011 года.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

6 КРАСАВІКА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№7 (15814)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Юрась ПАНКЕВІЧ: «Асвоіць дуду можа амаль кожны»

**Праз некалькі дзён Мінск стане сапраўдным сталіцай дударства: тут пройдзе вялікі «Дударскі фэст». У яго рамках адбудзецца канцэрт гуртоў, якія ў сваёй музыцы выкарыстоўваюць інструменты розных народаў, а даследчыкі і майстры падчас навуковай канферэнцыі прадставяць свае найноўшыя знаходкі і адкрыцці. Сёння дуда, яе гучанне, канструкцыя, — не дзіва для беларусаў. Усё больш і больш музыкаў асвойваюць інструмент, усё больш зразумелымі становяцца ўрокі грання на ім, а навуковыя пошукі фалькларыстаў, культуролагаў — глыбейшымі. Пра пераемнасць традыцый, змену пакаленняў музыкаў і сакрэты навучання сёння мы гутарым з майстрам, дударом, лідарам гурта Рawa Юрасём ПАНКЕВІЧАМ, які стаяў каля вытокаў сучаснага дударства.**



***— Цяпер фэст ладзіцца не штогод, як было раней, а толькі раз на два гады. Да таго ж Дударскі клуб не праводзіў традыцыйных танцавальных вечарын у гэтым сезоне. Як табе падаецца, публіка засумавала па такіх імпрэзах?***

— Думаю, што не. Гурт Рawa і многія іншыя каманды досыць часта выступаюць у Мінску і іншых гарадах. Ды і танцавальныя вечарыны, дзе любіць бавіць час моладзь, таксама праходзяць незалежна ад дзейнасці Дударскага клуба. Больш таго, Мінск перастаў быць сталіцай руху. Вельмі актыўна далучыліся да справы нашы сябры з Маладзечна, дзе танцы пад дуду таксама сталі рэгулярнымі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Правілы гульні

# Вучыўся на бюджэце? Вяртай даўгі!

## ШТО ВЫПУСКНІКАМ ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

**Вясна для выпускнікоў устаноў прафесійнай адукацыі — напружаны і трывожны час, бо менавіта цяпер вырашаецца іх далейшы лёс. Сёлета па шэрагу кірункаў падрыхтоўкі адбудзецца падвоены выпуск спецыялістаў, якія навучаліся па чатырох- і пяцігадовай праграме вышэйшай школы. Сітуацыя на рынку працы складваецца даволі напружаная. Знайсці работу без прафесійнага досведу навaспечаным маладым спецыялістам не так ужо і проста. Але гэта не перашкаджае выпускнікам марыць быць размеркаванымі ў любы населены пункт, дзе ёсць метро, пажадана ў навукова-практычны цэнтр, прычым адразу «вузкімі» спецыялістамі. Перспектыва адправіцца ў глыбінку мала каго прываблівае... Як ставіцца да будучага размеркавання — як да сацыяльнай перавагі або як да малапрыемнага абавязку — няхай кожны вырашае для сябе сам. А мы дапаможам будучым выпускнікам знайсці адказы на пытанні, якія будуць для іх актуальныя ў найбліжэйшыя месяцы.**

### Каго размяркуюць абавязкова?

Усіх, хто правучыўся на дзённай бюджэтнай форме не менш за палову ад агульнага тэрміну навучання. Гэта значыць, што студэнт ВНУ, які навучаўся за кошт бюджэтных сродкаў і быў адлічаны, напрыклад, на трэцім курсе, а затым аднавіўся і давучваўся ўжо за кошт уласных сродкаў, таксама можа быць размеркаваны. Пры гэтым тэрмін працы па размеркаванні не змяншаецца прапарцыянальна часу навучання за кошт уласных сродкаў: выпускнік будзе абавязаны адпрацаваць па размеркаванні два гады, як і яго аднакурснікі-«бюджэтнікі». А вось пры разліку сумы, якую выпускнік абавязаны будзе вярнуць дзяржаве ў якасці кампенсацыі за сваё нежаданне працаваць па размеркаванні, час яго платнага навучання ўключацца не будзе.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У БДПУ за маладымі спецыялістамі выстройваюцца ў чэргі работадаўцы.

Калі студэнт больш за палову тэрміну вучыўся за кошт бюджэтных сродкаў, а затым перавёўся на платнае завочнае аддзяленне, то ён таксама трапляе пад размеркаванне. За выключэннем выпадку, калі ўжо працуе па сваёй спецыяльнасці.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Мары — збываюцца!

# «МАРКЕР» ДЛЯ ЛЕЙКАЦЫТАЎ, ці Навошта фізіку паяльнік

**Малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізікі газавага разраду Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава НАН Беларусі Аляксандра КАЗАК за распрацоўку плазменнай устаноўкі для стэрылізацыі медыцынскага інструмента і лячэння некаторых хвароб сёлета атрымала стыпендыю Прэзідэнта краіны. Пра сваю любоў да фізікі і тое, як у даследаваннях дапамагае... сабака, яна расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Любоў да канструктараў характэрна не толькі для хлопцаў.**

### Плазмай па мікраарганізмах

— Асноўная сфера прымянення маёй распрацоўкі — барацьба з рознага кшталту мікраарганізмамі, — тлумачыць дзяўчына. — На аб'ект уздзейнічаюць газавыя кампанентамі, якія ўзнікаюць у паветры падчас разраду: мона- і дыяксід азоту, азоцістая кіслата і азон. Думаю, многія чулі пра так званы NO-тэрапію і азанаванне, гэта нешта падобнае.

Стэрылізацыя інструментаў і паверхняў, прадуктаў харчавання і ўпаковак для іх, зажыўленне хранічных і гнойных ран — з усімі гэтымі праблемамі паспяхова спраўляецца распрацоўка маладога вучонага. Акрамя таго, плазма дапамагае хутчэй залечваць невялікія свежыя раны і драпіны — монааксід азоту з'яўляецца своеасаблівым «маркерам» для лейкацытаў, якія «падказвае» месца пашкоджання. Аляксандра не хавае, што выпрабоўвала ўстаноўку на сабе, і сцвярджае, што пасля апрацоўкі плазменным струменем зажыўленне праходзіць у разы хутчэй. Яшчэ адзін паддоследны — сабака дзяўчыны, які хварэе на хранічны атыт. Пасля некалькіх працэдур сімптомы зніклі.

Калі большасць плазменных установак сілкуецца ад крыніц магутнасцю ў дзясяткі кілавольт, то распрацоўка Аляксандры патрабуе не больш за адзін кВ. Акрамя гэтага, многія аналагі патрабуюць імпульснага току — разрад зноў і зноў праскоквае паміж электродамі, з-за чаго метал, фактычна, «выпарваецца». У праекце дзяўчыны выкарыстоўваецца пастаянны ток — разрад адбываецца адзін раз, а потым толькі падтрымліваецца, што дапамагае захаваць электроды і пазбегнуць металізацыі тканак.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# Вучыўся на бюджэце? Вяртай даўгі!

## Куды можна размеркавацца?

Да любой юрыдычнай асобы, не мае значэння, прыватная гэта арганізацыя ці дзяржаўная. Але, паводле Палажэння аб размеркаванні, пераважнае права на задавальненне сваёй патрэбы ў спецыялістах мае базавая арганізацыя. Гэта структура, якая заключае дагавор з установай адукацыі аб узаемадзеянні і, адпаведна, бярэ на сябе абавязацельствы па забеспячэнні студэнтаў рабочымі месцамі для практыкі і працаўладкавання маладых спецыялістаў. Згодна з дагаворам, базавая арганізацыя можа аказваць дапамогу і ў арганізацыі вучэбнага працэсу — напрыклад, у стварэнні на прадпрыемстве кафедраў. «Базавая арганізацыя» — паняцце дастаткова шырокае: гэта могуць быць і акцыянерныя таварыствы, і рэзідэнты Парка высокіх тэхналогій, і бюджэтныя арганізацыі.

Пасля задавальнення патрэб у спецыялістах непасрэдных заказчыкаў кадраў можа весціся размеркаванне выпускнікоў у адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй у іншыя арганізацыі — на падставе іх пісьмовых заявак.

Пісьмовыя заяўкі арганізацый — заказчыкаў кадраў і іншых арганізацый будуць задавальняцца ў наступных выпадках:

— калі выпускнікі ўключаны ў банк звестак адоранай моладзі і банк звестак таленавітай моладзі;

— калі запыты паступілі з арганізацый, дзе выпускнікі праходзілі вытворчую і пераддыпломную практыку;

— калі адсутнічаюць месцы працы, якія адпавядаюць пададзеным ва ўстанову адукацыі заказчыкамі кадраў заяўкам на падрыхтоўку спецыялістаў.

**Апратэставаць вынікі размеркавання немагчыма. Але застаецца яшчэ пераразмеркаванне.**

Прасцей кажучы, персанальныя заяўкі будуць задавальняцца або ў выпадку адсутнасці заявак ад непасрэдных заказчыкаў кадраў, або ў выпадку наяўнасці такога важнага аргумента, як праходжанне выпускніком практыкі на пэўным прадпрыемстве ці ў арганізацыі. Аднак гарантыі, што персанальная заяўка будзе задаволена, усё ж няма.

Да таго ж у персанальнай заяўцы павінна быць дакладна прапісана, на якую пасаду вас бяруць, і калі прапанаваная вам пасада не адпавядае профілю вашай спецыяльнасці, то такую заяўку могуць смела праігнараваць. Трэба разумець, што размеркаванне — гэта працаўладкаванне па спецыяльнасці.

## Якім чынам вызначаецца чарговасць размеркавання?

Рашэнне аб размеркаванні выпускніка прымаецца з улікам:

— вынікаў яго паспяховасці; удзелу ў навукова-даследчай дзейнасці, грамадскай рабоце;

— месца праходжання вытворчай і пераддыпломнай практыкі;

— стану здароўя, сямейнага становішча і месца жыхарства сям'і;

— рэкамендацыі ўстановы адукацыі аб найбольш мэтазгодным накіраванні выпускніка на працу і яго асабістых пажаданняў.

## Ці можна адмовіцца ад размеркавання па прычыне невыдзялення наймальнікам жылля?

Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агаворана ў накіраванні на працу і працоўным дагаворы (кантракце). Аднак забеспячэнне маладога спецыяліста жыллём — гэта права, а не абавязак наймальніка. Адзіная гарантыя ў гэтай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, стаць на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без дадатковых патрабаванняў па неабходным тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце. У тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## Чым адрозніваецца размеркаванне ад мэтавага накіравання?

Па-першае, мэтавае накіраванне гарантуе бясплатнае навучанне і пастаянную стыпендыю, але «адмазацца» ад адпрацоўкі ці памяняць месца працы амаль нерэальна. Выпускнік мусіць адпрацаваць на прадпрыемстве, з якім ён і яго ВНУ заключылі дагавор. Напрыклад, перад паступленнем у педуніверсітэт малады чалавек падпісвае з аддзелам адукацыі дагавор і абавязуецца пасля заканчэння вучобы вярнуцца працаваць у родныя мясціны. І нават калі за час навучання зменіцца яго сямейнае становішча і жыццёвыя планы, пасля атрымання дыплома ён усё роўна будзе абавязаны туды вярнуцца.

Па-другое, калі працаваць па размеркаванні пасля ВНУ прыйдзецца два гады, то па мэтавым накіраванні — аж пяць гадоў.

## Як атрымаць свабодны дыплом?

Установа адукацыі павінна выдаць свабодны дыплом, калі не можа забяспечыць выпускнікоў месцамі для размеркавання згодна з заканадаўствам. Калі заявак менш, чым выпускнікоў, то выпускніку могуць прапанаваць працаўладкаванне не зусім па яго спецыяльнасці. Апошнім часам размеркавацца не зусім па сваёй спецыяльнасці прасцей, чым затым пераразмеркавацца. І гэта таксама трэба мець на ўвазе. Таму, калі камісія не можа забяспечыць выпускніку працу па спецыяльнасці, патрабуйце даведку аб свабодным працаўладкаванні.

Апошнім часам жаданне быць накіраванымі на першае працоўнае месца ўсё часцей выказваюць і студэнты-«платнікі». У выпускніка, які навучаўся за ўласныя сродкі, ёсць магчымасць адмовіцца ад накіравання, але толькі да таго моманту, пакуль ён не падпіша з наймальнікам кантракт. Выпускнік можа паехаць на месца размеркавання, агледзецца, ацаніць узровень заработнай платы, умовы працы, наяўнасць сацыяльных гарантый, арганізацыю, нарміраванне працы і для сябе прыняць рашэнне наконт свайго далейшага працаўладкавання. Калі ён наогул адмаўляецца ад гэтага месца працы, то вяртаецца ў сваю навучальную ўстанову і здае выдадзенае накіраванне. Узамен атрымлівае даведку аб свабодным працаўладкаванні. У адрозненне ад выпускніка-«бюджэтніка», да яго не могуць прымяніць ніякіх карных санкцый. Магчыма, тым, хто канчаткова не вызначыўся з далейшымі жыццёвымі планамі, ёсць сэнс пайсці на кампраміс — напрыклад, заключыць кантракт тэрмінам не на два гады, а на год. Адным словам, трэба ўзважыць усе «за» і «супраць», бо кантракт ёсць кантракт.

## Ці можна пайсці вучыцца далей?

Лепш за ўсё не рабіць перапынкаў паміж навучаннем і паступаць, напрыклад, ва ўстанову вышэйшай адукацыі — у год заканчэння сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы, а ў магістратуру — у год заканчэння навучання на першай ступені вышэйшай школы.

Паступленне на платную форму навучання ў магістратуру пасля бюджэтнага навучання ў ВНУ зараз магчымае толькі пасля адпрацоўкі размеркавання па выніках навучання на першай ступені ці пасля вяртання сродкаў адпаведна неадпрацаванаму тэрміну.

Пры паступленні ў магістратуру павінны выконвацца тры асноўныя ўмовы, каб размеркаванаму выпускніку не давялося вяртаць у бюджэт сродкі за сваё навучанне на першай ступені. Па-першае, паступіць у магістратуру неабходна ў год заканчэння навучання на першай ступені вышэйшай адукацыі; па-другое, навучанне ў магістратуры павінна праходзіць за кошт бюджэтных сродкаў і, па-трэцяе, дапускаецца толькі дзённая форма атрымання адукацыі. Пры адпаведнасці гэтым крытэрыям выпускнік зможа здаць сваё накіраванне ва ўстанову адукацыі, якая яму яго выдала, а пытанні размеркавання вырашаць пасля паспяховага заканчэння магістратуры.

**Апошнім часам размеркавацца не зусім па сваёй спецыяльнасці прасцей, чым затым пераразмеркавацца.**

Выпускнік магістратуры можа быць размеркаваны нанова альбо накіроўваецца на адпрацоўку па месцы першага свайго размеркавання. Калі пасля заканчэння навучання на першай ступені ён адпрацаваў адзін год і толькі затым паступіў на дзённую форму навучання магістратуры, то, адпаведна, яму неабходна будзе выбіраць: сумяшчаць працу з навучаннем, што магчыма толькі пры ўмове геаграфічнай блізкасці месца працы і ўстановы адукацыі, або вяртаць дзяржаве сродкі за адзін неадпрацаваны год.

## Якія меры можа прыняць выпускнік, нязгодны з вынікамі размеркавання?

Максімум, што камісія можа для яго зрабіць, гэта адкласці разгляд справы да выніковага пасяджэння. Магчыма, за гэты час ён зможа дакументальна афарміць сваю пазіцыю і дабіцца іншага месца размеркавання ці атрымаць магчымасць свабоднага працаўладкавання. Апратэставаць вынікі размеркавання немагчыма. Але застаецца яшчэ пераразмеркаванне, падставы для якога таксама яшчэ трэба будзе камісіі даказваць.

## Ці можна «адкупіцца» ад размеркавання?

Яшчэ на этапе размеркавання выпускнік можа заявіць пра сваё нежаданне працаваць па размеркаванні ці мэтавым накіраванні і звярнуцца па разлік сумы сродкаў, выдаткаваных на яго навучанне. Пасля ўнясення сродкаў ён можа атрымаць даведку аб свабодным працаўладкаванні.

У тым выпадку, калі малады спецыяліст не прыступіў да працы ці звольніўся да заканчэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі і не жадае вяртаць у бюджэт сродкі ў добраахвотным парадку, грошы будуць спаганяцца з яго ў судовым парадку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

*Хачу на журфак!*

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

**Вельмі радуе, калі нашы юныя і маладыя няштатныя аўтары спрабуюць падаваць свае «пробы пяра» ў самых разнастайных жанрах: эсэ, замалёўка, нататка, інтэрв'ю, рэпартаж. На жаль, па шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын гэтыя спробы не заўсёды заканчваюцца поспехам і матэрыял так і не з'яўляецца на старонках газеты. Паспрабуем коратка растлумачыць чаму.**

Рэпартаж — гэта пераказ у сённяшняй газеце таго, што адбылося ў жыцці ўчора. У пэўных выпадках, калі няма абавязковай прывязкі да даты, а толькі да падзеі, гэты тэрмін не адыгрывае такой важнай ролі. Тады рэпартаж можа быць апублікаваны і пазней. Напрыклад, аповед пра адзін дзень дзяжурства журналіста з брыгадай «хуткай дапамогі». Абітурыент наўрад ці зможа падрыхтаваць такі матэрыял, але тым не менш.

Нагадаю, што маладзёжны дадатак «Чырвонка. Чырвоная змена» выходзіць двойчы на месяц, значыць, гаварыць пра нейкую рэпартажнасць не выпадае апрыёры. І галоўная памылка нашых маладых няштатных аўтараў якраз у тым, што яны робяць стаўку менавіта на даты: святкаванне Дня роднай мовы, Масленіцы, 23 лютага, 8 Сакавіка і г. д. Гэта выглядае прыкладна так. Скажам, у школе адбылося нейкае свята. Праз некалькі дзён самастойна або па падказцы настаўніцы ці кіраўніка гуртка журналіст-пачатковец вырашае напісаць рэпартаж. Гэты працэс таксама займае пэўны час. У выніку рэдакцыя атрымлівае «пробу пяра» ў лепшым выпадку (!) праз тыдзень-два пасля падзей, што адбыліся. А калі прайшло яшчэ больш часу? Гэта дапушчальна для школьнай насценнай газеты, але не для рэспубліканскага перыядычнага выдання. Паклаўшы руку на сэрца, прызнайцеся, аўтары, вам самім было б цікава чытаць пра тое, што адбылося даўно і ўжо забылася? Тыя мерапрыемствы трэба выкарыстоўваць для таго, каб заўважыць там, напрыклад, цікавага чалавека — будучага героя публікацыі, пазнаёміцца з ім, дамовіцца пра сустрэчу.

Некалькі слоў пра інтэрв'ю — не менш папулярны жанр у нашых юных і маладых аўтараў. Як метад — гутарка з чалавекам — ён ляжыць у аснове многіх матэрыялаў. Але зусім не абавязкова кожны раз афармляць іх у форме пытанняў і адказаў. Пачутае можна пераказаць і сваімі словамі. Аўтары ж часта скрупулёзна фіксуюць кожнае сказанае іх героем слова. Навошта? Калі вы спыталі ў некага, скажам, пра кур'ёзны выпадак з жыцця, а суразмоўнік адказаў, што такіх не было, не трэба гэта выкарыстоўваць. Бо што вы хацелі паведаміць чытачу, калі насамрэч нічога не адбылося? У жывой гутарцы такія пытанні задаваць трэба, але напісанне тэксту на падставе размовы мае на ўвазе ягю абавязковую літаратурную апрацоўку. Што гэта азначае?

Любому з нас уласціва хваляваацца, нешта забываць. Таму жывая гутарка часта можа быць хаатычнай, хоць на слых гэта і не заўсёды заўважна. Мы штосьці прыгадалі, вярнуліся да ранейшага пытання, суразмоўнік даў нагоду для незапланаванага пытання — на тое гэта і жывыя стасункі. Але на паперы лепш не выкладаць усё пачутае ў храналагічным парадку. «Раскіданыя» пытанні-адказы трэба аб'ядноўваць тэматычна. Калі, скажам, вы гаворыце з нейкім выканаўцам, першым блокам могуць ісці пытанні пра яго зварот да творчасці. Другі блок — здабыткі, дасягненні. Далей можна распытаць пра творчыя планы. Калі суразмоўнік не супраць, адхіліцеся ад музычнай тэмы і задайце некалькі пытанняў пра яго сям'ю, аб'яднаўшы іх у чарговы адзіны блок.

Бывае так, што любы адказ візаві (нават аднаскладовы, якім бы ён ні быў) мае значэнне. Але ў большасці выпадкаў, калі вы ўсё ж вырашылі напісаць сваю публікацыю менавіта ў жанры інтэрв'ю, раім аб'ядноўваць некалькі простых пытанняў у адно. Адпаведна, тое ж зрабіць і з адказамі. Напрыклад: «З якога ўзросту вы пачалі займацца музыкай? Памятаеце свае першыя спробы напісання песень? Як да гэтага паставіліся вашы родныя?»...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

*Мазгавы штурм*

# У СВЕТ МОВЫ З «ВАВЁРКАЙ»

**Гэты праект створаны пяццю аднагрупніцамі з Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Лізавета Бурая, Лізавета Коцік, Вераніка Хвораст, Наталля Чобат і Карына Якімук — студэнткі трэцяга курса факультэта інфармацыйных тэхналогій, яны атрымліваюць у БДТУ адукацыю па спецыяльнасці «Дызайн электронных і вэб-выданняў». Даведаўшыся, што ў хуткім часе будзе праводзіцца хакатон на тэму адукацыі, вырашылі паспрабаваць у ім свае сілы (тым больш што дэканат факультэта заахвочвае студэнтаў да ўдзелу ў такіх мерапрыемствах). Але з выбарам тэмы ўзніклі складанасці...**



Злева направа: Лізавета Коцік, Карына Якімук, Лізавета Бурая, Вераніка Хвораст і Наталля Чобат.

— Мы задумаліся: а якія праблемы ёсць у школе, — успамінае Вераніка. — Які прадмет дзецям даецца складаней за іншыя? Думалі пра англійскую мову, нават пра мовы праграмавання. Але потым сышліся ў меркаванні, што найбольш праблем з беларускай. Многія, напрыклад мая пляменніца, не разумеюць, навошта ім вучыць мову... Таму вырашылі стварыць адукацыйны партал.

Хакатон (конкурс для распрацоўшчыкаў, якія супольна працуюць над вырашэннем пэўнай праблемы) праходзіў у фармаце «нон-стоп» на працягу 48 гадзін. На месцы правялі лёсаванне: хто малюе макет сайта, хто праграмуе, каму давядзецца прыдумляць заданні для віктарыны, а каму — ствараць лагатып. Пэўна, найбольш складанай часткай працы была менавіта «моўная» — дзяўчаты шчыра прызнаюцца, што ўзровень валодання беларускай у іх вельмі розны (хтосьці нават лепш ведае англійскую), але калектыўны розум нівеліраваў гэтую загану. Вынікам «мазгавога штурму» стаў партал з трох частак: уласна адукацыйнай, якая ўключае інтэрактыўныя практыкаванні і пытанні, заснаваныя на школьнай праграме вывучэння роднай мовы, забаўляльнай (3D-квэсты з выкарыстаннем акуляраў дапоўненай рэальнасці — гульцу прапаноўваюць выбрацца з пакоя, знаходзячы прадметы і пазнаючы беларускіх гістарычных дзеячаў) і інтэрнэт-крамы (за заробленыя пры праходжанні квэсту балы можна атрымаць зніжкі і набыць аксесуары, падарункі, кашулі з вышыўкай і іншыя рэчы). З назвай вызначыліся хутка — бусел падаўся трывіяльным, таму на ролю талісмана «прызначылі» вавёрку.

Не дзіўна, што праект перамог, хоць дзяўчаты сціпла зазначаюць, што гэта стала для іх абсалютнай нечаканасцю. Максімум, на які спадзяваліся, — трэцяе месца. Прызам стала паездка на стартап-канферэнцыю Slush у Хельсінкі.

Трохі пазней каманда заявілася на яшчэ адзін конкурс — «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу», які праводзілі Міністэрства адукацыі і кампанія МТС. І зноў перамога, цяпер у намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект для бацькоў».

— На жаль, пакуль што ўсё існуе толькі ў выглядзе прататыпаў і ідэй у нашых галовах, — тлумачыць Лізавета Бурая. — Для рэалізацыі такога маштабнага праекта патрабуецца не толькі шмат грошай, але і часу, а таксама людскіх рэсурсаў (як мінімум неабходны прафесіянал-мовазнаўца). Рэалізаваць вялікі праект на канікулах ці на выхадных не атрымаецца. Таму пакуль што мы шукаем спосабы для яго ажыццяўлення.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Ідэі маладых*

# «ІДЭАЛЬНЫ ХМАРАЧОС»,

## або Як разбіць агарод у цэнтры сталіцы

**Ідэя пабудаваць «ідэальны хмарачос» прыйшла да Ільі Катлярскага і Настассі Лемяшонак, студэнтаў пятага курса спецыяльнасці «Архітэктура» БНТУ. Іх куратар Георгій Заборскі падтрымаў ідэю і прапанаваў выбраць пляцоўку для будучай інсталяцыі амаль у цэнтры сталіцы — на вуліцы Кастрычніцкай, у рамках правядзення фестывалю Vulica Brasil. Неўзабаве гараджане ўбачаць гэты незвычайны праект у поўным памеры — ён мае вышыню шэсць метраў. —**



— Новыя шматпавярховыя будынкі, якія з'явіліся ў сталіцы, разбураюць водна-зялёны дыяметр Мінска. А ён, наадварот, павінен стаць брэндам горада. Толькі нашы архітэктары здагадаліся спраектаваць сталіцу такім чынам, каб яна ачышчалася ад забруджванняў. Але хмарачосы, якія з'явіліся ў апошнія гады, замінаюць паветру спакойна гуляць па Мінску, — лічаць Настасся і Ілья.

Менавіта таму многія архітэктары задумваюцца, як зрабіць «ідэальны хмарачос», які будзе, з аднаго боку, экалагічна спрыяльным, а з другога, — функцыянальным. Інсталяцыя, створаная маладымі людзьмі, уключае і першае, і другое. Ілья раскрывае сутнасць праекта:

— Элементы «ідэальнага хмарачоса» — энергаэфектыўныя тэхналогіі, аднаўляльныя крыніцы энергіі і экалагічна чыстыя матэрыялы. Мы хочам зрабіць такое месца, куды людзі будуць прыходзіць проста таму, што ў іх ёсць вольны час...

І сапраўды — у «хмарачосе» прадугледжана шмат функцый. Па-першае, там ёсць барная зона, дзе будзе прадавацца вулічны фаст-фуд. Каб прасунуць ідэю гарадскога агарода, маладыя архітэктары пераўтвараць барную стойку знутры ў парнік для вырошчвання зеляніны. Яе можна будзе сарваць, памыць і з'есці. Прадугледжаны месцы для сядзення, арэлі і сцэна. Дарэчы, адна са сталічных школ танцаў ужо зацікавілася гэтай прасторай і плануе зладзіць там перфоманс. Акрамя гэтага, будзе арганізаваны абмен рэчамі: на спецыяльных паліцах можна будзе іх пакінуць ці ўзяць неабходныя. Гэта як буккросінг, але больш маштабны. Сюрпрыз будзе і для тых, каму не хапае сонечнага святла.

— Мы хочам спраектаваць такі фокус — «вяртанне сонца», — расказвае Ілья. — Калі яно ўвечары заходзіць за цэх, які стаіць насупраць, на вуліцы ўжо цень. Але мы паставім люстэрка, якое перанаправіць прамяні ўнутр нашага збудавання.

— А на другім паверсе першапачаткова задумвалася галерэя, — дадае Настасся. — Ёсць спецыяльныя лесвіцы, якія апускаюцца толькі тады, калі ты можаш да іх дастаць і пацягнуць. А для гэтага трэба быць высокім, таму дзеці туды без нагляду не залезуць. Кожны модуль зверху можа з'яўляцца аправай карціны або чаго-небудзь іншага, — гэта і стварае галерэю. Вялікую ролю адыгрываюць эмоцыі, якія хочам выклікаць у гараджан. Мы паспрабуем стварыць магію. Над зонай, дзе размесціцца сцэна, сядзенні і арэлі, будзе вітраж, які пераламляе прамяні і фільтруе іх. Гэта светлавое абмежаванне прасторы. Ты знаходзішся ў іншым святле і па адчуваннях, як у іншым памяшканні, хоць ніякіх сцен няма.

«Хмарачос» — вельмі «самастойная» пабудова. Зарадка для тэлефонаў працуе ад сонечных батарэй, ад іх жа ідзе энергія для кропельнага паліву раслін. Гэта сістэма, у сваю чаргу, бярэ ваду з бака, куды кроплі сцякаюцца з навеса падчас дажджу. Начная падсветка таксама працуе на «самаакупнасці».

— Мы запісалі відэа, намалявалі схемы, каб усім было зразумела, што плануем рабіць. У нас ёсць падарункі для тых, хто адгукнецца і захоча дапамагчы. Мы дорым паштоўкі, постары з работамі мастакоў Vulica Brasil, але самая цікавая прапанова — імянны модуль. Наш «хмарачос» складаецца з 66 модуляў, таму ён можа перасоўвацца ў іншае месца. Кожны спонсар, які ахвяруе грошы менавіта на адну з гэтых частак, можа напісаць на ім сваё імя ці тое, што ён пажадае. Мы збіраем грошы толькі на каркас, бо спонсараў, з якімі дамаўляемся наконт сонечных батарэй і іншага напаўнення, ужо знайшлі.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*




# АПАНТАНАСЦЬ ПРАВІЛАМІ

**Калі вам падалося, што ўсе навокал зацыкліліся на здаровым ладзе жыцця, то... вам не падалося. Калега нядаўна вырашыла харчавацца правільна. Праз месяц паскардзілася: «Раней, калі сустракаліся з сяброўкай, выбіралі кавярні па прынцыпе «што б нам хацелася з'есці: бліны, пасту, піццу?» А цяпер думаем, куды б на гарбату схадзіць».**

Пра складаныя вугляводы, клятчатку і біцэпс бядра ведае, бадай, кожны другі. І ў прынцыпе клапаціцца пра свой арганізм — гэта добра. Пакуль справа не даходзіць да фанатызму.

Насамрэч апантанасць правільным харчаваннем (па-навуковаму — артарэксія) са здароўем мае мала агульнага: жорстка сплянаваны рацыён, абмежаваная колькасць прадуктаў (прычым часта незразумела, па якой логіцы праводзіўся адбор), харчаванне па гадзінах і панічны страх з'есці штo-небудзь забароненае.

Адна дзяўчына, якая падсела на здаровы лад жыцця, расказвала ў сацсетках, як тыдзень рыхтавалася да таго, каб пакаштаваць торт у кавярні, што вельмі хваліла яе сяброўка. Калі дзень «ікс» настаў, Насця з раніцы зрабіла працяглую трэніроўку і не ела ўвесь дзень. А пасля таго як нарэшце адведала доўгачаканы дэсерт, запанікавала, што калорый у ім было ў два разы больш, чым яна разлічвала. «У той дзень я прайшла 28 кіламетраў. Торт я ела днём, а пасля з'ела на вячэру салату з курыцай без запраўкі і ўсё. Я не парушыла свой дзённы калараж. Я была проста шчаслівая... І гэта апісанне толькі аднаго моманту з тортам! Колькі тут мітусні, пустых думак, трывогі, перажыванняў», — дзеліцца Насця сваёй гісторыяй.

Сацыяльныя сеткі, дарэчы, толькі «падаграваюць» залежнасць. Скажам спадзяюся, калі кожнае тваё фота ў трэнажорцы ці здымак адварной курыцы з агародніннай набірае процьму «лайкаў». (Хоць калі вы, як у анекдоце, фатаграфуеце для Інстаграма клубніцы, а самі тым часам уплятаеце пельмені, то хваляваца няма чаго.) Даследчыкі артарэксіі якраз адзначаюць, што да новай хваробы схільныя маладыя, няўпэўненыя ў сабе дзяўчаты. Той факт, што яны ўжываюць правільную ежу і захоўваюць дысцыпліну, дае ім магчымасць адчуць гордасць за сябе і перавагу над астатнімі.

**Апантанасць правільным харчаваннем са здароўем мае мала агульнага.**

«Мяне бесіць мая знаёмая. Усе яе размовы — толькі пра трэніроўкі і калорыі», — пішуць на форумах. Гэта яшчэ адзін пабочны эфект артарэксіі. І справа зусім не ў зайздрасці. Ну, немагчыма доўга вытрымаць кампанію чалавека, у прысутнасці якога нельга з'есці круасан і не выклікаць асуджэння!

На нашым імкненні да здаровага — не, хутчэй, правільнага — ладу жыцця, упэўнена, нядрэнна зарабляюць маркетолагі. Чытала нейк пра рацыён адной расійскай тэлевядучай. Вада з хларафілам, чайны грыб, грачаная локшына з авакада, салата з фенхелю з марскімі грабянькамі... Не самае таннае меню.

Ці ўзяць бялковыя кактэйлі. На ўпакоўцы вялікімі літарамі напісана, што ў іх змяшчаецца палова дзённай нормы бялку. Прывабна. Але столькі ж пажыўнага рэчыва можна атрымаць, з'еўшы звычайны пачак тварагу. Толькі апошні больш танны і натуральны. Увогуле, этыкеткі прадуктаў з надпісамі «фітнес» і «малакаларыйны» трэба вывучаць удвая больш уважліва.

У ідэале здаровая ежа і спорт павінны паляпшаць жыццё, а не абмяжоўваць яго. Калі вы не прафесійны атлет, то памятаць колькасць бялкоў, тлушчаў і вугляводаў у кожным прадукце і штодзень праводзіць трэніроўкі на ўсе групы мышцаў неабавязкова. Дастаткова ведаць, што замест таго, каб ляжаць у выхадныя на канапе, лепш пагуляць у валейбол, а піражное ўвечары карысна замяніць на кефір. Хоць пішуць, што і 50 грамаў сала ў дзень не пашкодзіць фігуры. А ў дыетычным меню знаходзіцца месца нават для масла і какавы з цукрам. Напэўна, таму, што яго складалі ўрачы, а не маркетолагі.

Камертон настрою

# «Бярозка» перамен не баіцца!

**Галоўны рэдактар газеты ці часопіса адразу ж уяўляецца сур'ёзным чалавекам з багатым прафесійным і жыццёвым досведам. А вось выданням для школьнікаў і студэнтаў пойдзе на карысць не толькі вопыт, але і маладосць, смеласць, рызыкоўнасць. Таму і навіну пра тое, што новым галоўным рэдактарам часопіса «Бярозка» стала 22-гадовая Кацярына ЗАХАРЭВІЧ, многія ўспрынялі пазітыўна. Маўляў, маладой актыўнай дзяўчыне, якая сама піша прозу і вершы, лягчэй будзе знайсці агульную мову з чытачамі, пераважна школьнікамі. Сёння мы гутарым з Кацярынай пра тое, якія змены чакаюць «Бярозку» ў хуткім часе і якіх аўтараў заўсёды рады вітаць у рэдакцыі.**



***— Адчуваеце адказнасць перад чытачом. Магчыма, страшна?***

— Не магу сказаць, што пачуццё адказнасці вырасла — я прывыкла да думкі, што хтосьці, магчыма, чытае мае тэксты, і гатовая адказаць за свае словы. Што сапраўды страшна, дык гэта падвесці калег ці пазаштатных аўтараў: няправільна зразумець іх, сапсаваць працу лішняй праўкай. Баюся стаць рэдактарам, які перашкаджае выданню.

***— Якія тэмы на старонках часопіса выклікаюць найбольшы рэзананс, становяцца самымі чытанымі?***

— Мне здаецца, прайшлі тыя часы, калі матэрыялы друкаваных СМІ горача абмяркоўваліся, аспрэчваліся ці ўхваляліся. Прынамсі, наш патэнцыйны чытач, гартаючы выданне, прыслухоўваецца: ці адпавядае яно яго інтарэсам, ці будзе карысным, ці дапоўніць светапогляд. Калі адказ «не», то ніхто не напіша гнеўны ліст у рэдакцыю, а знойдзе іншую крыніцу інфармацыі, якая яго задаволіць. У гэтым ёсць праблема: мы ніколі не даведаемся дакладна, што трэба нашай мэтавай аўдыторыі. Але ёсць і добрая навіна: існуюць чытачы — і іх даволі шмат — з якімі мы супалі. Што датычыцца канкрэтных матэрыялаў, то са свайго пункту гледжання магу сказаць, што самымі выйгрышнымі здаюцца калумністыка, псіхалагічныя і сацыяльныя матэрыялы. І забаўляльныя артыкулы — куды ж без іх?

***— Якім павінен быць тэкст, каб яго апублікавалі?***

— Напісаны неабыякавым аўтарам. Зразумела, што далёка не ва ўсіх адразу атрымліваецца зрабіць добры матэрыял, але калі аўтару не ўсё адно, што пісаць і дзе друкавацца, то мы можам разам перапрацаваць тэкст некалькі разоў, пакуль ён не будзе дастаткова якасным.

***— Хто вашы аўтары? Рэдакцыйная пошта вялікая?***

— Большасць аўтараў «Бярозкі» — пазаштатнікі: вучні старшых класаў і студэнты. Калі часопіс толькі аднавіў самастойнасць, сабраць «рэдакцыйны партфель» было вельмі няпроста. Але цяпер, на шчасце, гэтай праблемы няма. З'явілася іншая — як змясціць максімум цікавых, карысных, важных тэкстаў на абмежаванай колькасці старонак. Мяне вельмі цешыць адчуванне, што праз «Бярозку» праходзіць пэўная плынь школьнікаў, захопленых журналістыкай і літаратурай. Яны пішуць нам, пэўны час «растуць» з намі, потым сыходзяць, а на іх месца прыходзяць наступныя.

***— Ці працуеце ў сецціве? Атрымліваеце там водгукі ад чытачоў?***

— Усе стасункі з аўтарамі і чытачамі падтрымліваю праз асабістыя старонкі ў сацыяльных сетках. Так кожны аўтар не застаецца проста іменем пад тэкстам, а бачыцца жывой асобай. І рэдактар — чалавек, да якога заўсёды можна звярнуцца з пытаннямі, папрацаваць разам. У прыват атрымліваю і водгукі на нумары — апошнім часам іх даволі шмат, абсалютная большасць — станоўчыя. Працуем, вядома, з суполкай «Бярозкі» «УКантакце». Я неймаверна ўдзячная Мары Шкляр, нашай пастаяннай чытачцы і аўтарцы, бо яна ўзяла на сябе вялікую частку працы ў суполцы проста таму, што любіць часопіс. Яшчэ літаральна нядаўна стварылі свой канал на YouTube і пакрысе здымаем ролікі, каб напаўняць яго.

***— Не так даўно часопіс крыху змяніў дызайн вокладкі, стаў больш сучасным па афармленні. І надалей плануеце эксперыментаваць з яго вонкавым выглядам?***

— Змены ў дызайне звязаныя са зменамі ў змесце. Са снежня мінулага года мы пачалі аб'ядноўваць матэрыялы кожнага нумара тэмай, дастаткова шырокай, каб можна было раскрыць яе максімальна разнастайна, і ў той жа час выразнай, каб яна «трымала» нумар. Напачатку я ўнутрана супраціўлялася гэтай ідэі, але, на шчасце, мяне ніхто не падтрымаў. Цяпер мы і па змесце, і па дызайне набліжаемся да той «Бярозкі», якую трымаем за ідэал. Эксперыментаў не баімся, і калі зноў адчуем патрэбу ў зменах, то чаму б і не?

***— Што плануеце змяніць у «Бярозцы», а што — пакінуць традыцыйным, звыклым для чытачоў?***

— Мне здаецца, што галоўная традыцыя часопіса — пастаянна мяняцца. І напрамак гэтых змяненняў кожным сваім тэкстам вызначаюць аўтары, кожным водгукам — чытачы, і кожным працоўным днём — рэдактары. Галоўная мая задача — сабраць гэта ў сістэму, не прыціскаючы сваім бачаннем.

***— Вы і самі актыўна пішаце паэзію і прозу. У якім жанры падабаецца працаваць найбольш?***

— Не назвала б сваё «пісьменніцтва» актыўным — пішу толькі тады, калі зусім няма чым апраўдаць непісанне. Мне заўсёды трэба мець абгрунтаванне, навошта я пішу, і гэтае абгрунтаванне ніхто так не руйнуе, як я сама, — ці то з-за звышпатрабавальнасці, ці то з-за звышлянаты. Больш падабаецца пісаць вершы — у гэтым працэсе найменш працы. Як бы ні было смешна чуць, што вершы аднекуль прыходзяць, са мной гэта адбываецца менавіта так. Мне здаецца, што ў паэзіі больш складана ў нечым незаўважна памыліцца. І ў той жа час любая памылка ў вершы больш вартая даравання, чым у прозе, таму што не ў поўнай меры залежыць ад аўтара.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

# Гатовыя насіць дзетак на руках

**Валанцёрскі атрад «Адкрытыя сэрцы» пярвічнай арганізацыі БРСМ ААТ «Гомсельмаш» вось ужо трынаццаць гадоў дорыць дабро, шчасце і любоў тым, хто мае ў іх патрэбу найбольш за ўсіх. Атрад аб'ядноўвае больш як 60 актывістаў, якія працуюць на прадпрыемстве пераважна ў цэху рэжучых барабанаў. Валанцёры не толькі прымаюць удзел ва ўсіх гарадскіх і рэспубліканскіх акцыях, але і самі арганізуюць іх.**

На адрас прадпрыемства штогод прыходзяць удзячныя лісты ад адміністрацыі Гомельскага абласнога дома дзіцяці для дзяцей з паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы і парушэннямі псіхікі, а таксама ад тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна абласнога цэнтра. Варта адзначыць, што валанцёрскі атрад з моманту свайго існавання рэгулярна ўдзяляе ўвагу маленькім насельнікам дома дзіцяці. Напрыклад, калі апошні мяняў адрас знаходжання, актывісты дапамагалі пры транспарціроўцы, літаральна пераносячы на руках выхаванцаў дзіцячага ўзросту. Мужчынскія моцныя рукі заўсёды патрэбныя дому дзіцяці: валанцёры слясараць, выконваюць ролю рознаробачых. Члены атрада заўсёды адзначаюць з хлопчыкамі і дзяўчаткамі ўсе галоўныя святы, рыхтуюць ім падарункі, дораць масу станоўчых эмоцый і ўражанняў. І гэта далёка не адзіны кірунак дзейнасці «Адкрытых сэрцаў».

Так, сіламі атрада аказваецца дапамога Гомельскаму гарадскому музею гісторыі ў прыборцы прылеглай тэрыторыі. Валанцёры пастаянна ўдзельнічаюць у гарадскіх спаборніцтвах добраахвотных пажарных дружын і другі год запар займаюць першае месца. Не засталася без іх увагі і дабрачынная акцыя для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра з удзелам легендаў гомельскага футбола. Для дзяцей, пазбаўленых бацькоўскай апекі, нядаўна ў фотастудыі прайшла кранальная акцыя «Дары дабро», падчас якой валанцёры падарылі выхаванцам сацыяльна-педагагічнага цэнтра незабыўную фотасесію. «Адкрытыя сэрцы» зноў жа нядаўна аказалі дапамогу бабулі, якая выхоўвае малалетняга ўнука-інваліда. Валанцёры набылі для яго сродкі асабістай гігіены, дзіцячае харчаванне, памперсы. І ўсё гэта пад дэвізам «Тварыць дабро лёгка, варта толькі паспрабаваць!»



**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «МАРКЕР» ДЛЯ ЛЕЙКАЦЫТАЎ...



Фота Надзеі БУЖАН.

**Першым выпрабавальнікам устаноўкі, як гэта нярэдка бывае, стала сама вынаходніца.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Доследная ўстаноўка створана, — расказвае Аляксандра, — далей да работы павінны прыступіць біёлагі і эканамісты. Я ж вазьмуся за нешта новае, фізіка плазмы мяне па-ранейшаму цікавіць. Акрамя таго, буду працягваць займацца фундаментальнай навукай. У мяне ўжо выйшлі 34 публікацыі і нават артыкул у калектыўнай манаграфіі. Цяпер працую над кандыдацкай дысертацыяй.

## У пошуках неардынарнага

— Мой бацька — электрык, пэўна, ад яго ўсё і пайшло, — прыгадвае дзяўчына. — У дзяцінстве любіла круціць і разбіраць усё запар. Неяк дапамагала мяняць разеткі — устроіла феерверк. Але ўсё абышлося. Увогуле, без лішняй сціпласці, я была здольным дзіцем: пачала размаўляць і хадзіць у восем месяцаў, першыя словы прачытала ў паўтарагадовым узросце. Падчас паступлення іншыя ВНУ, акрамя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, нават не разглядала. Выбірала толькі паміж факультэтамі: фізічным і прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Хадзіла на дні адкрытых дзвярэй, кірмашы факультэтаў. Схілілася ў бок першага, бо мяне пераканалі ў тым, што там даюць добрую базу і па матэматыцы, і па фізіцы, і па праграміраванні.

Пасля паступлення Аляксандра абрала навукова-даследчую дзейнасць — яшчэ з шостага класа марыла працаваць у Акадэміі навук. Дзяўчына запэўнівае: пра свой выбар не пашкадавала, хоць на малодшых курсах часам праводзіла ва ўніверсітэце дні напралёт. На яе думку, фізічны факультэт БДУ вылучаецца тым, што студэнтаў вучаць не канкрэтным алгарытмам дзеянняў для рашэння задач, а творчаму і неардынарнаму падыходу да любой праблемы. Менавіта таму многія выпускнікі ідуць у навуку — сферу, дзе супрацоўнікі самі шукаюць для сябе неардынарныя задачы.

**«Ён мне кажа: «Ты хочаш тут працаваць? Але ў нас трэба свідраваць». Я адказваю: «Умею свідраваць».**

Мара пра Акадэмію навук спраўдзілася яшчэ на трэцім курсе — на кафедры атамнай фізікі, дзе вучылася дзяўчына, гэта стандартная практыка: студэнтаў заахвочваюць працаваць у навуковых установах, з якімі супрацоўнічае факультэт.

— Выдатна памятаю сваю гутарку з загадчыкам лабараторыі, калі прыйшла сюды, — смяецца Аляксандра. — Ён мне кажа: «Ты хочаш тут працаваць? Але ў нас трэба свідраваць». Я адказваю: «Умею свідраваць». Загадчык зноўку: «У нас трэба паяць». Кажу: «А ў мяне ёсць уласны паяльнік». Можа, гэта і стала вырашальным фактарам? Хаця, думаю, па мне было відаць, што матывацыя — бязмежная. Дарэчы, паяльнік быў падарункам ад аднагрупнікаў на дзень нараджэння.



**Тэмпература разраду ў плазме можа дасягаць дзвюх тысяч градусаў Кельвіна.**

## Рознагалоссі — абгрунтаваныя!

— Адзін з галоўных плюсоў маёй работы — магчымасць паўдзельнічаць у канферэнцыях, — сцвярджае аспірантка. — Я ніколі столькі не падарожнічала, як пасля прыходу ў інстытут! Пэўна, найбольш запомнілася паездка ў Сербію — туды мяне «саслалі» на двухтыднёвую стажыроўку ў адну з лабараторый Бялградскага ўніверсітэта, з якім мы цесна супрацоўнічаем. Задачай было правесці даследаванні свайго струменя на іх абсталяванні і ўбачыць плазменны струмень, які атрымалі сербскія навукоўцы. Гэта быў вельмі карысны досвед. Вядома, уразіў і сам горад, дастаткова сказаць, што ў Бялградзе знаходзіцца музей легендарнага фізіка Ніколы Тэслы. Яшчэ была ў Бельгіі, Славакіі, Расіі...

Нягледзячы на такую любоў да навукі, часу на асабістае жыццё аспірантцы таксама хапае — нядаўна яна выйшла замуж. Выбраннікам Аляксандры, што не дзіўна, стаў фізік — хлопец, што вучыўся на старшым курсе фізфака. Цяпер ён працуе літаральна цераз дарогу — у РУП «Геаінфармацыйныя сістэмы», дзе кіруюць дзейнасцю першага беларускага спадарожніка. Па словах дзяўчыны, агульная любоў да навукі сямейнаму жыццю не замінае. Хутчэй наадварот: канфліктаў паміж двума фізікамі практычна не бывае, усе рознагалоссі вырашаюцца простым патрабаваннем: «Абгрунтуй!»

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*




# ЮНКАРЫ, УВАГА!

**Сёння мы друкуем чарговыя найлепшыя «пробы пяра» юных і маладых няштатных аўтараў, што паступілі на наш творчы конкурс. Ён, між іншым, павольна выходзіць на фінішную прамую: не паспеем азірнуцца, як хутка падводзіць вынікі. Зробім мы гэта да пачатку ўступнай кампаніі. Таму тым, хто мае намер таксама паўдзельнічаць у творчым спаборніцтве, але яшчэ не наважыўся гэта зрабіць, раім крыху паспяшацца. Пераможцы, тыя, хто сёлета збіраецца паступаць на журфак, апроч грамат атрымаюць ад рэдакцыі рэкамендацыі. Нагадваем, што з умовамі правядзення конкурсу больш падрабязна можна пазнаёміцца ў нумары «Чырвонкі. Чырвонай змены» ад 21.10.2016 года або на сайце газеты «Звязда» ў раздзеле «Праекты». Усім плёну і творчых поспехаў!**

## УДАР! І МЯЧ У ДЗЯВОЧЫХ ДАЛОНЯХ!

**Лічыцца, што некаторыя віды спорту — выключна жаночыя, а іншыя — толькі мужчынскія. Шаснаццацігадовая Марыя Свідуновіч, гулец жаночай зборнай Беларусі па футболе, служыць выдатным прыкладам таго, што сучасныя дзяўчаты могуць усё!**



Маша займаецца футболам з дванаццаці гадоў. Цікавасць да гэтага віду спорту з'явілася дзякуючы сястры, якая даўно гуляла ў нападзенні.

— Каця часта трэніравалася ў двары, а я стаяла на варотах, і ў мяне гэта добра атрымлівалася, — успамінае дзяўчына.

Таму, калі Марыя прыйшла ў прафесійную каманду, адразу выбрала пазіцыю галкіпера:

— Вам не перадаць, што я адчуваю, калі мяч аказваецца ў маіх руках! Але ёсць і мінусы: шматлікія траўмы і памылкі, якія ўсе абавязкова заўважаюць. Нават калі ты будзеш увесь матч гуляць выдатна, але прапусціш недарэчны гол, запомняць менавіта гэты момант.

Юная спартсменка пачынала ў зборнай Кобрынскага раёна. Да гэтага часу з удзячнасцю ўспамінае першага трэнера Рыгора Антонавіча Ачыпоўскага, які ладзіў турніры ў гонар 8 Сакавіка і вазіў каманду на абласныя спаборніцтвы. Гэта дзякуючы яму Маша паступіла ў Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву і трапіла ў зборную краіны. У яе складзе ўдзельнічала ў фінале чэмпіянату Еўропы ў адборачным раўндзе, у міжнародных таварыскіх матчах. Магчыма, у будучыні імя Марыі Свідуновіч стане гэткім жа вядомым, як імя варатара амерыканскай жаночай зборнай Хоўп Сола, якая з'яўляецца яе кумірам.

Маша плануе прысвяціць жыццё спорту і трэніраваць падлеткаў, як Ірына Іосіфаўна Булыгіна. Пра свайго цяперашняга трэнера гаворыць з захапленнем: «Яна ўсю душу ўкладвае ў трэніроўкі і патрабуе гуляць на максімуме. Заўсёды разумее і выконвае свае абяцанні. Яна для нас як другая мама».

Сумяшчаць вучобу і трэніроўкі, па словах Машы, нескладана, галоўнае — жаданне і любоў да ўсяго, што робіш. На пытанне, ці цяжка было б ёй без футбола, яна адказала: «Маё жыццё не будзе такім разнастайным без пастаянных трэніровак, без эмоцый, якія адчуваеш на полі. Калі б забаранілі гуляць, мне было б вельмі сумна».

У вольны час Марыя любіць чытаць, асабліва творы Стывена Кінга. Яго заблытаныя гісторыі прымушаюць браць кнігу ў рукі зноў і зноў.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ, вучаніца 11 класа СШ №11 г. Маладзечна.**

### ПРА АЎТАРА

Ангеліне — 17 гадоў. Яна кажа, што ў школе яе любімы прадмет — гісторыя.

— І ў гэтым заслуга найперш майго любімага настаўніка Віктара Эдуардавіча Жука, пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года — 2015», — кажа наша аўтарка.

Яшчэ дзяўчыне падабаецца творчасць Ясеніна і Маякоўскага, часта чытае іх вершы на розных мерапрыемствах. У вольны час Ангеліна любіць маляваць. А таксама з задавальненнем дапамагае маме дагледзець брацікa, які нарадзіўся зусім нядаўна.

Сёлета наша аўтарка хоча паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ.

## «КАЛІ ЗАКЛІКАЮ РАЗМАЎЛЯЦЬ НА РОДНАЙ МОВЕ — РАБЛЮ ГЭТА ПА-БЕЛАРУСКУ»

**На пасадзе першага сакратара Дзяржынскай раённай арганізацыі БРСМ Кірыл Шлык — усяго год. Але колькі сябе памятае сам, заўсёды быў ініцыятыўным і актыўным. Хлопцу падабалася рабіць нешта карыснае, дапамагаць іншым. Да таго, як заняць цяперашнюю пасаду, Кірыл быў мясцовым дэпутатам, працаваў дырэктарам Дома культуры. Кажа, што яму заўсёды падабалася мець стасункі з рознымі людзьмі. «Але я разумеў, што ў мяне не так шмат магчымасцяў, каб дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Таму калі прапанавалі новую работу і аднагалосна падтрымалі — пагадзіўся», кажа суразмоўца.**

***— Вы ўсю нашу сустрэчу размаўляеце па-беларуску...***

— Я вельмі люблю родную мову. Лічу, што чалавек абавязкова павінен ведаць сваю нацыянальную мову, каб яна не стала «мёртвай». Родная мова — у нашай ДНК. Нават размаўляючы па-руску, мы ўсё роўна робім гэта з беларускім акцэнтам, шмат выкарыстоўваем беларускіх слоў. У апошнія гады родная мова стала больш папулярнай. Мы бачым гэта ў тым ліку па рэкламе на тэлебачанні. Вядомыя брэнды пераходзяць на беларускую мову, на ёй здымаецца больш фільмаў. Карыстаюцца папулярнасцю і курсы «Мова нанова» — яны збіраюць каля 500 чалавек штотыднёва, працуюць ва ўсіх буйных гарадах нашай краіны.

Што датычыцца Дзяржыншчыны, то і ў нас тэндэнцыя вельмі станоўчая. Напрыклад, калі я працаваў дырэктарам Чаркаскага Дома культуры, мы ладзілі беларускамоўныя дыскатэкі, падбіралі па 10—15 прыгожых мелодый. Імкнуліся далучыць людзей да сучаснай беларускай музыкі, бо не ўсе ведаюць, што ў нашых аўтараў, напрыклад, ёсць вельмі прыгожыя кампазіцыі. Кожную дыскатэку завяршалі песняй «Затрымай мяне» гурта «Аўра», і яна стала сапраўдным хітом. Штогод на Дзяржыншчыне праводзіцца раённае «Свята беларускай мовы», якое ў 2013 годзе я пачаў ладзіць у Доме культуры. Дарэчы, тады прайшоў і тыдзень беларускай мовы, у мерапрыемствах якога паўдзельнічала каля тысячы чалавек.

***— А што вы думаеце наконт «трасянкі»?***

— Сапраўды, яна даволі шырока распаўсюджана. Але гэта не значыць, што мы не павінны імкнуцца да правільнай, літаратурнай мовы. Мне спатрэбіўся амаль год, каб цалкам перайсці на беларускую мову. Я шмат чытаю на роднай мове, і мне прыемна адзначыць, што традыцыі класікаў беларускай літаратуры працягваюць прадстаўнікі маладога пакалення. На жаль, не ўсе гэта ведаюць. Важна зразумець, што беларуская мова — не толькі ў школьнай праграме. Яна жывая і натуральная, а яшчэ — крэатыўная, модная і вельмі прыгожая.

Мы плануем запусціць праект «Дзяржыншчына беларускамоўная», у якім будзем аб'ядноўваць людзей, якія папулярызуюць родную мову. Правядзём своеасаблівы перапіс насельніцтва і паглядзім, колькі нашых землякоў на ёй размаўляюць або імкнуцца размаўляць. Людзі змогуць знайсці аднадумцаў, атрымаць дапамогу. Бо што патрэбна напачатку? Знаёмыя, якія падзяляюць твае погляды. Калі браць шырэй, то толькі ўласным прыкладам можна аказаць на моладзь нейкае ўздзеянне. Калі я заклікаю размаўляць на роднай мове — я раблю гэта па-беларуску, калі прапаную слухаць нашу музыку — сам яе слухаю.

Я размаўляю на той мове, на якой гаварылі Янка Купала, Якуб Колас, іншыя выбітныя людзі гэтай зямлі. І мне прыемна гэта асэнсоўваць. Я адчуваю сваю далучанасць да гісторыі нашай дзяржавы, да яе культуры і традыцый.

**Ангеліна НОВІКАВА, вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Дзяржынска.**

### ПРА АЎТАРА

Сама сябе аўтарка называе вельмі актыўнай і пазітыўнай дзяўчынай. І разнапланавай асобай.

— З шасці гадоў займаюся танцамі, люблю спяваць, ствараць свае песні і вершы. Летась выйшаў зборнік, у якім ёсць і мае творы. Маю ўзнагароды з розных конкурсаў. У вольны час мне падабаецца чытаць, катацца на роліках, а таксама гуляць з сябрамі, — расказвае дзяўчына.

